ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ВЕРАСЕНЬ 3 1932 г. № 197 (4449).

Год выдаўня XVI

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Узмацніць барацьбу за колькасьць і якасьць тавараў шырспажыву. М. ПІКМАН—Кадры—грамадз кажу харчаванню (3 стар.).

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б АБ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ (1 стар.).

2-ГІ ПЛЕНУМ ЦСПСБ—Мабілізаваць масы на барацьбу за ліквідацыю адставаньня прамысловасьці (3 стар.).

Кожны пратэрмінаваны дзень зьніжае ўраджай азімых на 1-1 з пал. % (1 стар).

Бязьлітасна караць злодзеяў калгаснай маемасьці (2 стар.).

Закрыць спэкулянту і перакупшчыку шлях на калгасны рынак (2 стар.).

Датэрміновым выкананьнем пляну збожжазагатовак адкажам на ліст ленінградзкіх рабочых. (2 стар.).

Тав. ДОМБАЛЬ—віцэ-прэзыдэнт Акадэміі Навук Беларусі (3 стар.).

З АПОШНЯЙ ПОШТЫ — Канфэрэнцыя скончана... (4 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

Адкрыцьцё германскага рэйхстагу—прамова тав. Клары Цэткін. (4 стар.).

Супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць інтэрвэнцыі (4 стар.).

Узмацніць барацьбу за колькасьць і якасьць тавараў шырспажыву

XVII партыйная канфэрэнцыя адзначыла, што «для забесьпячэньня бальшавіцкіх тэмпаў уздыму ўсёй народнай гаспадаркі і паляпшэньня задаваленьня запатрэбаваньняў рабочых мас гораду і вёскі ў адносінах тавараў шырокага спажываньня першаступеннае значэньне мае разгортваньне тавараваароту». Але разгортваньне тавараароту ў канчатковым выніку залежыць ад паяўнасьці ў дзяржаве фондаў прамысловых і сельска-гаспадарчых прадуктаў. Чым больш горад будзе даваць вёсцы прамысловых тавараў, і ў першую чаргу шырокага спажываньня, тым больш павялічыцца прыток сельска-гаспадарчых прадуктаў з вёскі ў горад.

Вось чаму партыя і ўрад адначасова з разьвіцьцём калгаснага гандлю вялізарную ўвагу аддаюць пытаньню павялічэньня вытворчасьці тавараў шырокага спажываньня. Рад важнейшых пастаноў, вынесеных за апошні час партыяй і ўрадам, поўнасьцю забясьпечваюць вырашэньне гэтай важнейшай праблемы. За павялічэньне фондаў прамысловых тавараў шырокага ўжытку павінны змагацца ня толькі лёгкая прамысловасьць і прамысловая кааперацыя, прадукцыя якіх у асноўным ідзе на шырокі рынак. Партыя і ўрад абавязалі ўсе бяз выключэньня галіны прамысловасьці разгарнуць штодзенную барацьбу за мабілізацыю і скарыстаньне ўсіх унутраных рэсурсаў і магчымасьцяй для павялічэньня выпуску тавараў шырокага спажываньня.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які адбыўся ў ліпені г. г., прапанаваў усім мясцовым, партыйным і фабрычным арганізацыям **«паставіць задачу разгортваньня вырабу тавараў шырокага спажываньня, як адну з важнейшых задач гаспадарчай, партыйнай работы на прадпрыемствах, мабілізуючы на вырашэньне гэтай задачы масы рабочых, вынаходцаў, ІТР».**

Як-жа ажыцьцяўляюцца гэтыя важнейшыя ўказаньні партыі? Паводле даных **Наркамлёгпраму** лёгкая прамысловасьць у ліпені выканала сваю асноўную праграму на 82 проц., дадатковую — на 73,9 проц. Вынікі дзьвёх дэкад: месячнае заданьне выканана па асноўнай праграме на 56,7% дадатковай—59,1 проц. На сыстэме **Белмэтлаяб'яднаньня** амаль такі-ж малюнак: у ліпені дадатковая праграма па выпуску тавараў шырокага спажываньня выканана на 82,7 процантаў, плян жніўня за дзьве дэкады—на 41,5 проц.

Дрэваапрацоўчая прамысловасьць дадатковую праграму ў ліпені выканала ўсяго на 79 проц. У жніўні, калі падыйсьці да справы фармальна, плян нібыта перавыконваецца (за 2 дэкады 80 проц. месячнага заданьня), а па сутнасьці гэта простае «очковтирательство». Справа ў тым, што многія дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы рэалізуюць адкіды непасрэдна без уцілізацыі ў сябе на заводах і лічаць гэта як выкананьне дадатковай праграмы па вырабе тавараў шырокага ўжытку.

Нясумненна, што адкіды, якія нельга поўнасьцю уцілізаваць на прадпрыемстве, трэба і неабходна здаваць прамкааперацыі, пласобным саматужнікам і нават непасрэдна спажыўцу — калгасьніку і працоўнаму селяніну аднаасобніку. Аднак, гэта мерапрыемства ні ў якім разе нельга перабліваць з выкананьнем дадатковай праграмы па вырабе тавараў шырокага спажываньня. **Кожнае прадпрыемства павінна імкнуцца як мага больш уцілізаваць адкіды сваімі сіламі і сродкамі, шляхам арганізацыі спэцыяльных уцільцэхаў, брыгад і інш.**

З аднаго боку, трэба самым рашучым чынам змагацца супроць тэндэнцыі адмахнуцца ад арганізацыі уцільцэхаў і рэалізаваць адкіды ў неапрацаваным выглядзе, з другога — нельга дапускаць, каб тое ці іншае прадпрыемства і само нічога не рабіла і не давала адкідаў прамкааперацыі.

Немалаважнае значэньне мае барацьба з тэндэнцыямі выконваць дадатковую праграму за кошт скарыстаньня сырцу, што прызначан для асноўнай праграмы. На шэйнай фабрыцы **«Кастрычнік» замест уцілізацыі адкідаў уцільцэху адпусьцілі 3.000 мэтраў мануфактуры, з якой шылі дамскія фартухі, а польты заставаліся без падкладак. На заводзе імя Варашылава кацельнае жалезо рэзалі на адвалы і лемяхі для плугоў.** Такія тэндэнцыі маюць месца ня толькі на паказаных прадпрыемствах. Гэтыя тэндэнцыі трэба рашуча выкараняць. Асноўная задача і напрамак работы уцільцэху—максымальнае скарыстаньне і уцілізацыя адыходаў і адкідаў.

На сёньня па сыстэме **Наркамлёгпраму** арганізавана 28 уцільцэхаў, Белмэтлаяб'яднаньні — 3, Белдрэву — 4. Рэшта прадпрыемстваў гэтых сыстэм мае спэцыяльныя брыгады. Такім чынам, з колькаснага боку мы маем бязумоўныя посьпехі. Затое якасьць работы уцільцэху і брыгад зусім нездавальняючая. Яны яшчэ ня сталі неадлучнай часткай вытворчасьці. Многія кіраўнікі прадпрыемстваў працягваюць глядзець на уцільцэх, як на часовае мерапрыемства, а таму не аддаюць ніякай увагі яго абсталяваньню і забесьпячэньню рабочай сілай. Есьць рад фактаў, калі на некаторых прадпрыемствах (завод імя Варашылава, Бабруйскі дрэзапрацоўчы камбінат, віцебскі мэталапрацоўчы завод «Чырвоны мэталіст») рабочых, якіх спачатку выпачалі на уцілізацыю адыходаў, зараз забіраюць назад, а уцільцэхі пакідаюць без працоўнай сілы. Такое-ж становішча з варштатамі і інструментамі.

Барацьба з недаацэнкай і ігнараваньне уцільцэху — асноўнай вытворчай адзінкі па уцілізацыі адыходаў — важнейшая задача ўсіх партыйных і прафсаюзных арганізацый. Трэба прыняць усе меры да таго, каб уцільцэхі былі поўнасьцю забясьпечаны рабочай сілай і тэхнічна абсталяваны. Бяз гэтых дзьвёх умоў нармальная работа уцільцэхаў немагчыма.

Рэалізацыя прадукцыі—неадлучная частка барацьбы за шырспажыў. Мала вырабіць тавары. Трэба, каб гэтыя тавары па сваім асэртымэнце і якасьці поўнасьцю адпавядалі запатрэбаваньням спажыўцоў. Ці ўсё добра ў нас у гэтых адносінах? Далёка ня ўсё. Некаторыя прадпрыемствы, прыступаючы да вырабу з адкідаў прадметаў шырокага ўжытку, зусім ня цікавіліся ці знойдуць іх тавары спажыўца. Узяць хаця-б тую-ж фабрыку **«Кастрычнік».** Яна выпусьціла па некалькі тысяч рублёў пазушак для канап, невялікіх коўрыкаў. Усе гэтыя прадметы амаль не знаходзяць пакупца і ляжаць на складах. На заводзе **імя Молатава** доўгі час выраблялі зусім непатрэбныя вясковаму спажыўцу тумбачкі. Есьць выпадкі затаварваньня з прычыны дарагоўлі тавараў. Мала таго, што прадпрыемства выпускае прадметы з вялікім сабекоштам. Накладныя выдаткі часам дасягаюць амаль 100 процантаў.

Барацьба за ходкі і танны прадмет шырокага ўжытку побач з выкананьнем колькасных паказальнікаў павінна стаяць у цэнтры ўвагі фабрычна - заводзкіх арганізацый.

Вялізарнае значэньне для больш хуткага разгортваньня тавараароту мае пытаньне прасоўваньня прамысловых тавараў непасрэдна на вёску, да сельскага спажыўца. Пасьпяховае разьвіцьцё калгаснага гандлю с.-г. прадуктамі ў значнай ступені залежыць ад таго, як будзе снабжацца вёска прамысловымі таварамі і ў першую чаргу шырокага ўжытку. Вось чаму аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б абавязаў Белкаапсаюз **«на працягу 3 кварталу давесьці ўдзельную вагу завозу тавараў у вёску да 55 проц., устанавіўшы кожнаму тавару адпаведны процант у адносінах гораду і вёскі».**

Трэба проста сказаць, што гэта важнейшая дырэктыва партыі выкананасьцю далёка незыстарчальна. Можна прывесьці рад фактаў, калі тавары шырокага спажываньня ў асноўнай сваёй масе асядаюць у гарадох і раённых цэнтрах. Яркім прыкладам у гэтых адносінах служыць агідныя факты няправільнай рэалізацыі прадукцыі лясной прамысловасьці.

З лясных складаў дошкі, фаут, няліквіды амаль цалкам трапляюць замест вёскі—калгасьніка і працоўнага селяніна-аднаасобніка—розным установам, прадпрыемствам і жаўтам. Характэрна, што некаторыя мясцовыя арганізацыі, замест рашучай барацьбы з падобнымі зьявішчамі, патураюць ім. **Слуцкая** РВК-РСІ, напрыклад, дайшла да таго, што прапанавала мясцоваму лясному складу адпускаць дошкі толькі саўгасам.

Барацьбу з асяданьнем тавараў шырокага ўжытку ў гарадох і раённых цэнтрах трэба рашуча ўзмацніць. Дырэктыва пленуму ЦК і ЦКК па гэтым пытаньні ва што-б та ні стала павінна быць выканана.

Побач з гэтым трэба паказаць на зусім няправільныя, якія ў корані пярэчаць прынцыпам савецкага гандлю, тэндэнцыі з боку асобных прадпрыемстваў **(Шклоўская папяровая фабрыка** і інш.) рэалізаваць прадукцыю шырокага ўжытку, што вырабляецца з адыходаў, праз свае ЗРК шляхам простага тавараабмену на сельгаспрадукты калгасамі, калгасьнікамі і селянамі - аднаасобнікамі.

З «лявацкім» ігнараваньнем і скрыўленьнем прынцыпаў савецкага гандлю трэба змагацца з усёй бальшавіцкай рэзкасьцю і непрымірымасьцю. **Адначасова бязьлітасная барацьба са спэкулянтамі і перакупшчыкамі, якія іменуцца нажыцца на савецкім гандлі, правымі і «левымі» апартуністамі, дапамагаючымі ім у гэтым,—важнейшая задача партыі.**

Толькі пры ўмове спалучэньня ўсіх форм, барацьбы і мэтадаў партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы можна забясьпечыць пасьпяховае ажыцьцяўленьне балвых задач партыі аб разгортваньні вырабу і прасоўваньні ў вёску тавараў шырокага спажываньня.

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б АБ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ

ЦК КП(б)Б адзначае зусім нездавальняючы ход разгортваньня збожжазагатовак (па становішчы на 25 жніўня выканана—да гадовага пляну 5,8 проц. і жывеньскага—42 проц.).

ЦК канстатуе, што нездавальняючы ход збожжазагатовак тлумачыцца недапушчальна слабымі тэмпамі давядзеньня пляну збожжазагатовак да калгасу і вёскі па цэлым радзе раёнаў, адсутнасьцю масавай работы вакол збожжазагатовак, асабліва сярод аднаасобнікаў, ігнараваньнем задачы хутка і поўнасьцю сабраць збожжа па цьвёрдых заданьнях.

ЦК разглядае становішча справы з давядзеньнем пляну, як няўменьне раду раёнаў арганізаваць справу саміх збожжазагатовак. ЦК падкрэсьлівае, што нездавальняючы ход збожжазагатовак ставіць пад пагрозу забесьпячэньне хлебам прамысловых цэнтраў БССР і стварае дадатковыя труднасьці ў выкананьні асеньніх палявых работ.

ЦК прапануе таму ў тых раёнах, дзе пляны яшчэ не даведзены да калгасаў, сельсаветаў і вёсак, давесьці гэтыя пляны неадкладна, прыступіўшы зараз-жа да выкананьня пляну збожжазагатовак.

ЦК зноў указвае раённым і сельскім партарганізацыям, што давядзеньне пляну павінна атрымаць форму масавай растлумачальнай кампаніі, якая-б дапамагала найшырэйшым масам калгасьнікаў і працоўным аднаасобнікам усьвядоміць сувязь паміж збожжазагатоўкамі і ўсім ходам выкананьня народна-гаспадарчага пляну.

ЦК прапануе ўсім ячэйкам арганізаваць шырокія масы вакол лёзунгу, высунутага радам перадавых калгасаў—«скончыць з збожжазагатоўкі да 15-й гадавіны Кастрычніка». ЦК прапануе абгаварыць гэты заклік перадавых калгасаў, як і заклік пралетараў Ленінграду, у кожным калгасе. Прапанаваць другу ўсяляк папулярызаваць на сваіх старонках работу перадавых калгасаў, перадаўшы ўсім калгасам вопыт правядзеньня збожжазагатовак лепшымі калгасамі.

Канстатуючы, што аднаасобнікі па сутнасьці яшчэ ня ўцягнуты ў збожжазагатоўкі і лічачы, што галоўнай прычынай гэтага зьяўляецца зацяжка з давядзеньнем пляну да двара і адсутнасьць масавай работы, ЦК прапануе тым ячэйкам і сельсаветам, дзе пляны яшчэ не даведзены да двара, НЕАДКЛАДНА іх давесьці; пры давядзеньні пляну шырока ўцягнуць у гэту справу беднату і ўсю работу па арганізацыі збожжазагатовак у аднаасобным сэктары праводзіць з шырокім прыцягненьнем актывістаў—калгасьнікаў і бедняко-аднаасобнікаў.

ЦК канстатуе, што ў мінулых пяцідневках паўтараюцца сур'ёзныя памылкі леташніх загатовак—самацёк у адносінах выкананьня пляну кулацка-заможнымі элемэнтамі. ЦК прапануе неадкладна давесьці цьвёрдыя заданьні, строга ўлічваючы колькі кілёграм, які павінен быць здан па цьвёрдым заданьні. ЦК прапануе ўсім ячэйкам і сельсаветам, апіраючыся на калгасьнікаў і беднату, дабіцца таго, каб цьвёрдыя заданьні былі выкананы да 20 верасьня. Неабходна забясьпечыць рашаючую барацьбу з усякімі спробамі кулацка-заможных элемэнтаў саботажаць збожжазагатоўкі.

Лічачы зусім недапушчальным няздачу саўгасамі і калгасамі ў лік збожжазагатовак насеннай пазыкі, прапанаваць Наркамзему, Калгасцэнтру і Трактарацэнтру, пад адказнасьць т. т. Рачыцкага, Міцькова і Тамашэўскага, і ўсім РВК забясьпечыць выкананьне саўгасамі і калгасамі здачы насеннай пазыкі, устанавіўшы, што выкананьне здачы па насеннпазыцы павінна рабіцца ад начасова ў тэрміны, устаноўленыя для збожжазагатовак.

У сувязі з наяўнымі фактамі ў радзе раёнаў, а таксама непасрэдна ў вёсках, разгортваньня гандлю збожжам,—ЦК прапануе партыйным, савецкім арганізацыям дабіцца на справе правядзеньня дэкрэту ўраду аб збожжазагатоўках і пастановы аб забароне гандлю збожжам да 15 студзеня 1933 году, разгарнуўшы шырокую растлумачальную работу ў вёсцы вакол гэтых пастаноў. Супроць спэкулянтаў-перакупшчыкаў збожжа, кулакоў, зрываючых збожжазагатоўкі, павінны прымацца самыя суровыя меры, кіруючыся пастановай ЦК ад 31 жніўня гэтага году.

Абавязаць судовыя органы ў тэрміновым парадку разглядаць справы аб спэкуляцыі збожжам і арганізаваць рад узорных судоў над спэкулянтамі збожжа.

У сувязі з павялічэньнем раёнамі глыбінных загатоўчых пунктаў супроць устаноўленых для іх (Пятрыкоў і інш.), забараніць усім РК КП(б)Б павялічваць колькасьць глыбінак звыш устаноўленых, бяз згоды упаўнаважанага камзагспа. Прапанаваць тав. Фэльдману (Дзяржбанк) спыніць фінансаваньне незацьверджаных упаўн. камзагспа глыбінных пунктаў.

Гэту пастанову апублікаваць у друку.

1360 тыс. га азімых засеяць у тэрмін

КОЖНЫ ПРАТЭРМІНАВАНЫ ДЗЕНЬ ЗЬНІЖАЕ ЎРАДЖАЙ АЗІМЫХ НА 1—1½ ПРОЦ.

АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЕ--БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

Сёньняшняя зводка НКЗБ аб ходзе сяўбы азімых відавочна паказвае, што большасьць раённых арганізацый не паставілі ў цэнтр увагі сваёй работы пытаньне барацьбы за ўзьняцьце ўраджайнасьці сацыялістычных палёў.

На 30 жніўня, па БССР засеяна ўсяго толькі 71.780 га азімых, або 5,3 проц. да рэспубліканскага пляну. У параўнаньні з мінулым годам пасеяна больш на 15.895 га (на 1,2 проц.). Гэта нас ні ў якім разе ня можа задаволіць, бо прапускаюцца раньнія тэрміны сяўбы.

Лічбы, апублікаваныя Менскай сэлекцыйнай станцыяй (гл. «Зьвязда», № 195, 31 жніўня), самы лепшы агітатар ня за раньнюю сяўбу. Сабраны вопыт паказвае, што чым раней пасеш, тым больш ўраджай зьбярэш з палёў.

Як-жа рабіцьмуть партарганізацыі змагаюцца за раньнія тэрміны сяўбы, за высокі ўраджай. Толькі чатыры партарганізацыі — **Лёзьнянскім, Сураскай, Гарадоцкая і Клімавіцкая** на сёньняшні дзень паказалі бальшавіцкія тэмпы. Па **Лёзьнянскім** раёне плян выкананы на **37,7 проц., Сураскім — 33,5 проц., Гарадоцкім — 32,6 проц. і Клімавіцкім — 27,2 проц.** 7 раёнаў засеялі ад 20 да 30 проц. іншыя даюць сэрыя мізэрныя паказальнікі. Некаторыя раёны назад да сяўбы не прыступілі.

Нельга забываць, што **кожны пратэрмінаваны дзень з асеньняй сяўбой дасьць зьніжэньне ўраджайнасьці азімых на 1—1½ проц.** У той час, як раёны паўночнай зоны сяўбу павінны скончыць 5 верасьня, яны па сёньняшні дзень плян выканалі ўсяго толькі на 11,2 проц. Зацяжка сяўбы б'е па ўраджайнасьці, яна ня спрыяе арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў. Марудныя тэмпы сяўбы пельга інакш кваліфікаваць, як простае злачынства перад партыяй і ўрадам. Бліжэйшая пяцідневка павінна даць, асабліва па паўночнай зоне, рэзкі скачок у бок максымальнага павялічэньня засеянай плошчы азімых.

Задача кожнай партарганізацыі — дабіцца такой расстаноўкі сіл, каб ня было шматнага простою трактара, каб конная цягавая сіла была скарыстана рацыянальна. Змагаючыся з эмпірыцызмам стаўкай на парагвасьць кампаніі, трэба дабіцца такога становішча, каб усе працэсы асеньніх сельска-гаспадарчых работ (сяўба, зяблева, уборка, сілазаваньне) былі выкананы добраякасна і ў вызначаныя партыяй і ўрадам тэрміны.

Партыя будзе ацэньваць работу кожнай арганізацыі, ячэйкі і кожнага камуніста паасобку па тым, наколькі яны ўжо гэтай восеньню з усёй сур'ёзнасьцю, па-бальшавіцку возьмуцца за ажыцьцяўленьне цэнтральнага лёзунгу, наколькі яны мабілізуюць масы калгасьнікаў, рабочых саўгасаў, бедняко-аднаасобнікаў і серадняко-аднаасобнікаў на барацьбу за высокі ўраджай, за ўпчыльненьне тэрміны сяўбы, за раньняе зяблева

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе сяўбы азімых па БССР на 30 жніўня

№№ па ч.	РАЁНЫ	Плян.	Засеяна ў га.	Процант выканаўня.
	ПАЎДНЕВАЯ ЗОНА:			
1.	Глускі	15.800	1.100	5,9
2.	Пятрыкоўскі	15.800	949	5,8
3.	Братынскі	14.600	494	3,4
4.	Ельскі	11.200	380	3,4
5.	Камарынскі	6.500	215	3,3
6.	Рогачоўскі	28.500	939	3,3
7.	Церахаўскі	23.500	679	2,9
8.	Бабруйскі	28.500	632	2,2
9.	Уваравіцкі	16.500	324	2,0
10.	Нараўлянскі	14.000	272	1,9
11.	Парыцкі	19.000	348	1,8
12.	Мазырскі	26.000	382	1,5
13.	Отаробінскі	13.000	180	1,4
14.	Кармянскі	17.000	229	1,3
15.	Жлобінскі	24.000	321	1,3
16.	Любаньскі	11.700	137	1,2
17.	Лоеўскі	12.000	135	1,1
18.	Гомельскі	9.200	79	0,9
19.	Жыткавіцкі	6.000	50	0,8
20.	Тураўскі	4.800	38	0,8
21.	Хойніцкі	13.000	96	0,7
22.	Веткаўскі	24.500	165	0,7
23.	Лельчыцкі	9.600	59	0,6
24.	Буда-Кашалёўскі	12.000	—	—
25.	Рэчыцкі	25.000	—	—
26.	Чачэрскі	14.700	—	—
	Разам па зоне	419.400	8.208	2,0
	ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА:			
1.	Клімавіцкі	22.500	6.129	27,2
2.	Быхаўскі	29.200	4.998	17,1
3.	Клічаўскі	16.000	1.871	11,7
4.	Заслаўскі	14.000	1.533	11,0
5.	Барысаўскі	21.000	2.299	10,9
6.	Менскі	19.000	1.848	9,7
7.	Касьцюковіцкі	33.500	3.054	9,1
8.	Пленчаніцкі	14.500	1.029	7,1
9.	Лагойскі	14.800	950	6,5
10.	Мсьціслаўскі	24.000	1.390	5,8
11.	Смалявіцкі	19.000	1.087	5,7
12.	Дзяржынскі	18.000	1.013	5,6
13.	Шклоўскі	26.000	1.086	4,2
14.	Чаўскі	27.500	1.039	3,8
15.	Асіпавіцкі	12.700	385	3,0
16.	Пухавіцкі	29.000	717	2,5
17.	Чэрыкаўскі	17.000	348	2,0
18.	Вятахльскі	14.500	265	1,8
19.	Вузьдзенскі	12.500	220	1,8
20.	Чырвонапольскі	17.000	221	1,3
21.	Горацкі	27.000	325	1,2
22.	Чырвона-Слабодзкі	10.700	108	1,0
23.	Крупскі	21.000	202	1,0
24.	Слуцкі	24.000	40	0,2
25.	Старадарожскі	13.000	—	—
26.	Талочынскі	27.000	—	—
27.	Прапойскі	16.500	—	—
28.	Магілёўскі	26.500	—	—
29.	Крычаўскі	11.700	—	—
30.	Капыльскі	24.000	—	—
31.	Бярэзінскі	19.200	—	—
32.	Бялыніцкі	19.000	—	—
33.	Чэрвеньскі	19.000	—	—
	Разам па зоне:	660.300	32.166	4,9
	ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА:			
1.	Лёзьнянскі	16.300	6.142	37,7
2.	Сураскі	12.000	4.024	33,5
3.	Гарадоцкі	28.500	9.303	32,6
4.	Віцебскі	12.300	2.037	16,6
5.	Сіроцінскі	15.000	1.886	12,6
6.	Аршанскі	28.500	2.920	10,2
7.	Дубровенскі	16.000	1.288	8,1
8.	Полацкі	23.000	1.489	6,5
9.	Расонскі	14.000	911	6,5
10.	Лепельскі	20.500	678	3,3
11.	Сеньненскі	19.500	490	2,5
12.	Дрысенскі	16.200	238	1,5
13.	Асьвейскі	7.200	—	—
14.	Бешанковіцкі	17.800	—	—
15.	Вушацкі	17.000	—	—
16.	Чашніцкі	16.500	—	—
	Разам па зоне	280.300	31.406	11,2
	Усяго па БССР	1.360.000	71.780	5,3

Кіраўнік Пасэўбюро НКЗБ ТАРАСЕВІЧ.

Ельск яшчэ не падрыхтаваны

Плян засеву азімых па Ельскім раёне складае 11 тыс. га. Калгасы павінны засеяць 5.950 га, саўгасы 130 га і аднаасобнікі 4.920 га.

Ельскі раён павінен быў ужо распачаць сяўбу, але факты гаворань аб тым, што райарганізацыі не надалі гэтай важнейшай кампаніі належнай увагі, не забясьпечылі не своім кашэртным апэрацыйным кіраўніцтвам. У выніку гэтага раён сяўбы амаль не распачаў.

Райзэ і райкалгасаюз безадказна адносяцца да гэтай важнейшай кампаніі. У раёне ёсьць 72 сэлярскі, але райзэ нават ня ведае — падрыхтаваны яны да сяўбы ці не. «Ремонт праходзіць па ўсіх кузьнях», — адказваюць у райзэ, але сапраўднага становішча ня ведаюць.

Ёсьць сельсаветы (Санкоўскі, Ельскі і інш.), дзе дагэтуль яшчэ не абгаворваны пляны асеньняй сяўбы. Пасобныя калгасы: «Ульянаўск», «Бальшавік» падрыхтавалі пад засеў толькі па аднаму гэктару.

Калгас «Чырвоная данілаўка» нават стаў на шлях скарачэньня плошчы азімых, але райкалгасаюз, ня глядзячы на сыгналы эйтазэты, ня прыняў належных мер.

З—іч.

Каштоўнейшыя мінэральныя ўгнаеньні месяцамі валяюцца на чыгунках

Агра-бюракраты, якія зрываюць узьняцьце ўраджайнасьці

Эфэктыўнасьць мінэральных угнаеньняў ва ўмовах БССР на розных глебах ужо вядома шырокім масам рабочых саўгасаў і калгасьнікам. Практыка апошніх год паказала значэньне мінэральных угнаеньняў для ўзьняцьця ўраджайнасьці нашых палёў. Гэта пацьвярджаецца вялікімі запатрэбаваньнямі на розныя мінэральныя ўгнаеньні, якія зараз прад'яўляюць калгасы і саўгасы пры падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы.

Тым больш агіднымі зьяўляюцца адносіны некаторых нашых гаспадарнікаў да скарыстаньня завезенага ўгнаеньня, якім зараз завалены рад чыгуначных станцый, толькі таму, што яно свачасова не забіраецца.

Стынімся на фактах. На станцыі **Барысаў** з красавіка месяца ляжыць нявывезенымі 16 вагонаў розных угнаеньняў, у тым ліку і фасфарытная мука. Злоснымі віноватымі ў разбазарваньні і псаваньні каштоўнейшых угнаеньняў зьяўляюцца: **Плешчаніцкая МТС,** у адрас якой прыбыло 6 ваг., **Бягомльская МТС**—5 вагонаў, калгас **«Чырвоная Беларусь»,** калгас **імя «1-га мая»,** саўгас **«Палелюм»** і саўгас **«Бярэзіна».**

Такі-ж малюнак і на станцыі **Смалявічы**—з вясны ляжыць 11 вагонаў угнаеньняў. Саўгас імя Леніна, які знаходзіцца на адлегласьці 2 клм. ад станцыі, на працягу ўсяго лета ня здолеў вывезьці 1,5 вагонаў угнаеньня.

Саўгасы **«Вызваленьне», «Косіна», «Раванічы», «Новыя Зялені»** і Лагойская МТС таксама не забралі мінэральнага ўгнаеньня, якое запаўняе пляцформы станцыі. Адміністрацыя чыгункі ўжо зьбіраецца скарыстаць гэтыя ўгнаеньні, як баласт для пляніроўкі нагрузачна-выгрузачнай пляцоўкі.

На станцыі **Цёмны Лес** з красавіка ляжыць 11 вагонаў.

На станцыі **Ходасы**—3 вагоны, на ст. **Магілёў**—5 вагонаў угнаеньняў.

Вышэйпаданыя факты сьведчаць аб тым, што дырэктары раду саўгасаў і МТС самым грубым чынам ігнаруюць дырэктыву партыі аб скарыстаньні атрэтэхнікі ў барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці. Пытаньню хэмізацыі сельскай гаспадаркі імі не аддаецца ніякай увагі. Масавая арганізацыйна-растлумачальная работа сярод калгасьнікаў і рабочых саўгасаў таксама не праводзіцца.

Сельска-гаспадарчыя трэсты добра ведаюць пра ўсе гэтыя факты, але ніякіх мер ня прымаюць. Наадварот, некаторыя работ нікі трэстаў апраўдваюць такую безгаспадарчасьць. Напрыклад, для сьвінагадоўчага саўгасу **«Харомцы», Глускага раёну,** які павінен засеяць 180 гэкт. азімых, паступіла 61 тона фасфарытнай мукі і 18 тон суперфасфату. Гэтага ўгнаеньня як раз хопіць для азімага клину. Агранам саўгасу **Васільлеў** замест таго, каб мабілізаваць грамадзкасьць саўгасу для вывазу ўгнаеньня, адносіцца, «што з прычыны ўборкі зараз угнаеньні вывозьці нельга і наогул яно непатрэбна».

Работнікі **менскага трэсту Сьвінавод,** агранам **Кагнарскі** і адказны выканаўца па забесьпячэньні **Турцэвіч,** не праверыўшы фактычную забясьпечанасьць саўгасу Харомцы ўгнаеньнем, згаджаюцца з Васільлевым. Трэст Сьвінавод просіць перадаць прыбыўшае для саўгасу ўгнаеньня райкалгассаюзу.

Адмаўляючыся ад завезенага ўгнаеньня да асеньняй сяўбы і зяблева, работнікі саўгасу Харомцы і штампуючыя іх дзеяньні спэцыялісты з трэсту Сьвінавод зрываюць важнейшае мерапрыемства па ўзьняцьці ўраджайнасьці і стварэньні моцнай кармовай базы ў саўгасе.

Гэтыя факты з усёй выразнасьцю паказваюць, што справа барацьбы за ўраджайнасьць, барацьбы са стратамі ў сельскай гаспадарцы ня стала яшчэ справай усіх рабочых і ІТР саўгасаў.

Савецкая грамадзкасьць і кантрольныя органы не павінны дапусьціць, каб каштоўнейшыя сродкі на ўзьняцьці ўраджайнасьці—мінэральныя ўгнаеньні валяліся па некалькі месяцаў на чыгуначных станцыях і псаваліся па віне розных галавацяпаў.

Мы патрабуем, каб завезеныя мінэральныя ўгнаеньні на працягу 5 дзён былі забраны гаспадарнікамі і скарыстаны пад азімыя пасевы і зяблева.

Вінаватых у разбазарваньні ўгнаеньняў трэба прыцягнуць да судовай адказнасьці.

Верасэм.

Саўгас „Навасёлкі" зрывае раньнюю сяўбу

ВЕТКА. (Ад нашага спэцкора). Раньняя сяўба—асноўная ўмова ўзьняцьця ўраджайнасьці азімых. Кожны саўгас і калгас павінен зараз так расставіць свае сілы, каб не аслабляючы тэмпаў уборкі разам з тым свачасова правесьці сяўбу азімых і зяблеве ворыва.

Саўгас **«Навасёлкі»,** Радускага сельсавету, сустракае асеньнюю сяўбу зусім непадрыхтаваным. Дагэтуль ў гаспадарцы няма дакладнага пляну пасеву азімых. Дырэктар саўгасу тав. **ЗАХАРАЎ** ня ведае, якая плошча і якімі культурамі будзе занята пад азімыя. Значная частка ўзаранага папару не перабаранавана. На поле вывезена толькі 15 проц. патрэбнай колькасьці гною, зусім не распачат рамонт машын і інвэнтару. Пасьля сканчэньня веснавой сяўбы машыны раскіданы па ўсім саўгасе, ніхто не адказвае за іх захаваньне і пераласьць. Многія з іх зараз патрабуюць капітальнага рамонту. З прычыны абязьлічкі пасаваны два трактары «Фардзон».

Аб зяблевым ворыве і лушчэньні гэбы тут таксама ня думаюць.

М. НІКІЦІН.

Пачалі сяўбу азімых

УВАРАВІЧЫ.

Дзякуючы правільнай расстаноўцы рабочай сілы, саўгас «Уваравічы» пасьпяхова скончыў уборку збожжавых і ў бліжэйшыя дні канчае абмалот.

Зараз саўгас пераключыў большую частку рабочых на падрыхтоўку глебы для засеву азімых. На асноўным вучастку саўгасу ўжо засеяна 20 га азімага жыта. Па 3-х адхіленьнях саўгасу таксама пачалася сяўба.

А. К.

Раньняе сіласаваньне сарвана

БАБРУЙСК. Наркамзем у свой час вызначыў дакладныя тэрміны закладкі сіласу, асабліва зьвярнуўшы ўвагу на раньняе сіласаваньне. Весткі аб ходзе сіласаваньня на раёне сьведчаць, што як саўгасы, так і калгасы зрываюць гэта мерапрыемства. У саўгасах замест 6.940 тон засіласавана 250, калгасы з 9 тыс. тон заклалі 875.

Некаторыя калгасы зусім не клапоцяцца пра тое каб забясьпечыць жывёлу карчамі. Калгасы **імя К. Маркса,** Міхалёўскага сельсавету, **імя Будзённага,** Восаўскага сельсавету, і **«Чырвоная зорка»,** Сычкаўскага сельсавету, у мінулым годзе адтувалі недахват кармоў. Ня гледзячы на гэта, ні адзін кгр. сіласу ў гэтых калгасах не закладзен. Большасьць камсамольскіх ячэек нічога ня робяць для дапамогі калгасам у правядзеньні сіласаваньня. Райком камсамолу ні разу не абмяркоўваў гэтага пытаньня.

Пархамовіч.

Зьняць усякія абмежаваньні ў гандлі бульбай

ЗА АПОШНІЯ ДНІ Ў АСОБНЫХ

ЗАКРЫЦЬ СПЭКУЛЯНТУ І ПЕРАКУПШЧЫКУ ШЛЯХ НА КАЛГАСНЫ РЫНАК!

Не дапусьціць абмежаваньня калгаснага гандлю мясам

Пастанова камісіі выкананьня пры СНК БССР ад 31 жніўня 1932 г.

Заслухаўшы даклады пракурора рэспублікі тав. ЛЯЎКОВА і старшыні Белкалгасцэнтру тав. МІЦЬКОВА, камісія выкананьня пры СНК БССР устанаўляе, што дырэктывы партыі і ўраду аб скасаваньні абмежаваньняў па забоі жывёлы ў большасьці раёнаў БССР знайшлі канкрэтнае праламленьне.

Пасьля выданьня пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР і СНК БССР па рэспубліцы спынена 1.425 адміністрацыйных спраў, 53 судовых спраў і зьвернуты няправільна спагнаныя штрафы.

Побач з гэтым у некаторых раёнах ёсьць выпадкі невыстарчальнага нагляду райвыканкомаў і пракуратуры за ажыцьцяўленьнем указаных дырэктыў (Камарына, Рэчыца, Церахаўка, Магілеў, Гарадок і Смалявічы) і няўменьня, на аснове масавай растлумачальнай работы, забясьпечыць выкананьне пляну мясазагатовак і разгортваньне калгаснага гандлю мяснымі прадуктамі. Камарынскі райвыканком груба парушыў указаныя дырэктывы партыі і ўраду; да жніўня месяца не скасаваў сваіх абавязковых пастаноў аб забароне забою жывёлы, накладваў і спаганяў штрафы за забой маладняка і пасьля апублікаваньня пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб скасаваньні абмежаваньняў.

Камісія выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1) За грубае ігнараваньне важнейшай дырэктывы партыі і ўраду, старшыні Камарынскага райвыканкому тав. ВОЛКАВУ і ўсяму складу прэзыдыуму РВК абвясьціць вымову.

2) Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Юстыцыі і ўсім раённым выканаўчым камітэтам і надалей працягваць масавую растлумачальную работу аб сутнасьці і значэньні пастановы ЦК УсеКП(б) аб мясазагатоўках, праводзіць неаслабны кантроль за выкананьнем гэтай пастановы мясцовымі арганізацыямі, не дапушчаць няправільнага накладаньня штрафаў і адміністраваньня ў галіне калгаснага гандлю мяснымі прадуктамі, прыцягваючы да судовай адказнасьці вінаватых у парушэньні дырэктыў аб скасаваньні абмежаваньняў па забоі жывёлы і калгасным гандлі мяснымі прадуктамі.

Нам. старшыні камісіі выкананьня пры СНК БССР — І. ЛЫЧОЎ.
За сакратара камісіі выкананьня пры СНК БССР — Ф. СУЛКОЎСКІ.

„Чырвоны пуцілавец" разгортвае калгасны гандаль

ГАРАДОК. Калгас «Чырвоны пуцілавец» адказаў на пастановы ўраду аб загатоўках і калгасным гандлі сканчэньнем сяўбы ранней тэрміну, пашырэньнем пасеўнай плошчы: ільну — да 143 гэкт., замест 130, капусты — да 4, замест 3, гуркоў — да 4,3 га, замест 2,5. Гуркі — нябачаная справа! — сеялі на палявой зямлі. Сеялі і падсыпалі мінэральным угнаеньнем. Многія калгасьнікі думалі: «Дарма сеем, ня ўзойдуць».

Праўленьне калгасу, па чале з энэргічным старшынёй т. **Вольгавоньскім** (рабочы — 25-тысячнік) дабілася поўнага выкананьня сустрэчнага пляну. Усе культуры далі буйныя ўсходы. Узышлі і гуркі. Узышлі і вырасьлі на палявой зямлі, лепш нават, чым у каго-небудзь па агародзе. Гэта вынік барацьбы за падняцьце ўраджайнасьці. У гэтым вялікая заслуга праўленьня калгасу.

Наступіла пара ўборкі. Пасьпелі гуркі. Ураджай багаты. Надышоў час рэалізацыі плёну працы. Праўленьне калгасу заключыла дагавор з ЛСПО на адпраўку яму гародніны. У канцы ліпеня быў адпраўлен 51 цэнт. гуркоў па цане 1 р.-1,5 р. клгр. Прадаў калгас і гуркі сельснажытаварыству. Апошняе закупіла 8,9 тон. Частка была выкінута на калгасны рынак, дзе прадана больш 4 тон.

Апрача гэтага, засолена для ЛСПО 5,7 тон гуркоў. Паводле дагавору, калгас павінен засаліць 30 тон. Гэту лічбу можна лёгка перавыканаць, але няма тары. ЛСПО прыслала толькі 116 бочак, замест 500. Яно ня выконвае дагавору, не змагаецца за свячасовую загатоўку гародніны.

Да 15 жніўня калгас сабраў з 4 га 23,9 тоны гуркоў.

Ужо атрымана толькі за адны гуркі каля 15.000 руб., ня лічачы засоленых. Кожны гэктар ужо даў каля 4.000 руб. і яшчэ дасьць столькі-ж.

«Чырвоны пуцілавец» разгарнуў калгасны гандаль не аднымі гуркамі. Для ЛСПО адпраўлена 8,4 цэнт. раньняй капусты, для магазыну райкалгассаюзу — 4 цэнт., для віцебскіх — 3 цэнт. Калгас прадаў 11 тон раньняй бульбы, галоўным чынам, для Ленінграду і ЗРК швейнікаў г. Віцебску. Усяго выручана каля 20.000 руб. за раньнюю прадукцыю гародніны.

Гэта яшчэ ня ўсё. Яшчэ вясной калгас выручыў за памідоры каля 2.000 руб. Нават адна з прыгарадных гаспадарак гораду Віцебску купляла флянсы памідораў у калгасе «Чырвоны пуцілавец». Апрача таго, калгас забясьпечыў расадай капусты вялікілы калгасы і вёскі.

Ужо зараз, калі рэалізацыя прадукцыі далёка яшчэ ня скончана, калгас змог выдаць грашовыя аванасы калгасьнікам па 40 кап. на працадзень. Вось што атрымалі лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі. Фама **Захарэнка** выпрацаваў 845 працадзён і атрымаў авансам 338 руб. **Фёдар Рабко** (3 працадзольныя) выпрацаваў 580 працадзён і атрымаў 232 руб. **Башкоў Паўла** (3 працадзольныя) выпрацаваў 595 працадзён і атрымаў 232 руб.

У выніку разгортваньня калгаснага гандлю значна вырасла эканамічна-фінансавая магутнасьць калгасу, калгас узмацніўся арганізацыйна і гаспадарча. Ён адмовіўся ад новых крэдытаў і з посьпехам выплачвае старую запазычанасьць. Так, ужо ў гэтым годзе выплачана: банку 13.000 руб., МТС —2.500, розных авансаў зьвернута 6.000 рублёў.

Калгас добра выконвае пляны загатовак. Пры зрыве мясазагатовак у раёне, «Чырвоны пуцілавец» яшчэ ў першым квартале выканаў па 200 проц. свой гадовы плян. Выконваецца і плян здачы малака. Узмоцненымі тэмпамі здаецца збожжа.

Калгас «Чырвоны пуцілавец» правільна ажыцьцяўляе пастановы партыі і ўраду аб разгортваньні калгаснага гандлю пры ўмове «акуратнага выкананьня пляну загатовак перад дзяржавай».

А. Мінуцкі.

Вырваць спэкуляцыю з коранем

Партыя і ўрад рашуча паставілі пытаньне аб барацьбе са спэкуляцыяй. Спэкулянт, які імкнецца пажыцца за кошт рабочых і сялян, які хоча за кошт працоўных працягваць сваё паразытычнае існаваньне, зьяўляецца саюзьнікам бандыта. Толькі так можа стаяць пытаньне.

Трэба адзначыць, што дагэтуль рад мясцовых арганізацый скрозь пальцы глядзелі на спэкуляцыйную дзейнасьць клясава-варожых элемэнтаў, ня прымалі рашучых энэргічных мер да зьнішчэньня спэкуляцыі.

Брыгада РСІ і «Віцебскага пралетара», якая знаёмілася з работай органаў Наркам'юсту, міліцыі і гарфа г. Віцебску ў галіне барацьбы са спэкуляцыяй на калгасных рынках, у сваіх вывадах адзначае, што, ня гледзячы на ўказаньні партыі і ўраду аб тым, каб ня даць магчымасьці спэкулянтам пажыцца па разгортваньні калгаснага гандлю, — рашучых мер да барацьбы са спэкуляцыяй на Віцебску ня прынята. Асабліваю бязьдзейнасьць праявіла пракуратура, якая не перадала ў суд ні адной справы, якая ня ўзьняла паказальных працэсаў вакол спэкуляцыі. Гарфа прапаніў ведзацэнку гэтага пытаньня, не перадаўшы судовым органам ні адной справы. Палітыка невялікіх штрафаў спрыяла далейшай дзейнасьці спэкулянтаў, масаваму перапродажу с.-г. прадуктаў і ўздуваньню цэн.

У **Полацкім раёне** ў гэтым годзе было затрымана 46 спэкулянтаў, якія абкладзены мізэрным штрафам у 2.200 руб., прычым ні адзін не пераданы суду. Такое-ж становішча і ў **Рэчыцкім** раёне. У **Слуцкім** раёне за спэкуляцыю с.-г. прадуктамі пакарана 133 чал. На іх накладзен штраф у... 1.500 р., прычым толькі 5 чал. перадана суду. У **Аршанскім** раёне затрымана 119 спэкулянтаў, на ўсіх іх накладзен штраф у 6.200 руб. і ні адзін ня трапіў на лаўку падсудных. У **Асіпавіцкім** раёне затрымана 41 перакупшчык-спэкулянт прамтаварамі, усе яны пакараны штрафам, але далей справа не пайшла.

Зусім зразумела, што такія мяккацелыя адносіны да спэкулянтаў ні ў якім разе не маглі спрыяць ліквідацыі спэкуляцыі.

Рашучае і суровае пакараньне спэкулянтаў-паразытаў, выкрыцьцё ўсякіх спроб клясава-варожых элемэнтаў падарваць савецкі гандаль,—суровы абавязак усіх нашых арганізацый.

Спэкуляцыя павінна быць вырвана з коранем. Нельга спыняцца перад самымі суровымі мерамі для яе зьнішчэньня.

Б.

Тавары з „нагрузкай"

ЖЛОБІН. Побач з фактамі бязьдзейнасьці ґраду раённых арганізацый Жлобінчыны ў справе разгортваньня савецкага гандлю, маюць месца выпадкі скрыўленьня дырэктыў партыі і ўраду аб гандлі.

На савецкіх рынках Жлобіна шырока практыкуецца прымусовая выдача тавараў, так званы «прымусовы асартымэнт».

Калі, напрыклад, прадаюць рубахі, дык да іх абавязкова даюць у нагрузку шчоткі, гумкі. Такі выпадак меў месца 18 жніўня, калі рубашка разам з «нагрузкай» абышлася калгасьніку звыш 19 руб. У канцы жніўня з крамы інвалідаў выдавалі рубашкі з прымусовым асартымэнтам—чайнікам, якога ніхто не бярэ, бо якасьць яго вельмі нізкая. Калі ў краме ёсьць абутак, дык яго не прадаюць без таго, каб не навязаць якую-небудзь заваль, якой шмат накапілася ў крамах.

Раённая газэта «Шлях сацыялізму» ў перадавым артыкуле адзначала гэта недапушчальнае зьявішча. Аднак, ніхто не рэагуе на сыгналы друку.

З-пад увагі раённых арганізацый выпала пытаньне барацьбы з перакупшчыкам. На вачох у райфа і міліцыі спэкулянты купляюць у калгаснай краме па 5-10 літраў малака і праз поўгадзіны гэта-ж малако, разведзенае вадой, прадаюць па значна завышанай цане.

Каля двух месяцаў саўгас «Пірэнічы» зьбіраецца адкрыць ларок па продажу гародніны, фруктаў, малочных прадуктаў, але ні райснаб, ні РВК ня ідуць яму насустрач і дагэтуль ларок не адкрыты. На рынку не арганізаваны бюро даведак, пункты мэдычнай і юрыдычнай дапамогі. Няма ні аднаго зае́здкага двара, ні адной чайной для калгасьнікаў.

Просьба да газэты «Зьвязда» ўдарыць па скажэньнях лініі партыі ў калгасным гандлі і прымусіць жлобінскія арганізацыі пабавіць увагу за гэту справу.

Г. А.

ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК АДКАЖАМ НА ЛІСТ ЛЕНІНГРАДЗКІХ РАБОЧЫХ

Забясьпечыць рашаючы пералом

Апошняя зводка аб ходзе збожжазагатовак гаворыць аб адсутнасьці пералому ў кампаніі. Той факт, што да 25 жніўня выканана толькі **42 проц. месячнага заданьня**, сьведчыць аб зусім невыстарчальнай рабоце вакол загатовак.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб збожжазагатоўках, якая сёньня друкуецца, паказвае па прычыны гэтага адставаньня. Яно тлумачыцца «недапушчальна слабымі тэмпамі давядзеньня пляну збожжазагатовак да калгасу і вёскі па радзе раёнаў, адсутнасьцю масавай работы вакол збожжазагатовак, асабліва сярод аднаасобнікаў». У сваёй пастанове ЦК КП(б)Б адзначае, што становішча з давядзеньнем пляну сьведчыць аб няўменьні раду раёнаў **арганізаваць** справу збожжазагатовак.

Калгасы БССР да 25-га жніўня здалі толькі 14,2 проц. гадавога пляну. Ёсьць рыпадкі разбазарваньня калгаснага збожжа, прычым да раскрадвальнікаў ня прымаюцца меры суровага пакараньня. Пастановы ўраду аб ахове грамадзкай маемасьці не скарыстоўваюцца для сацыялістычнага перавыхаваньня калгасных мас і перамаганьня дробна-ўласьніцкіх тэндэнцый адсталых груп (**Лепель, Талачын, Чавусы, Шклоў** і інш.).

Зусім нездавальняюча ідуць загатоўкі па **аднаасобным сэктары**. Да 25 жніўня аднаасобнікамі здана 0,5 проц. гадавога заданьня. **«Аднаасобнікі па сутнасьці яшчэ ня ўцягнуты ў збожжазагатоўкі»** (з пастановы ЦК КП(б)Б). Галоўнай прычынай гэтага зьяўляецца зацяжка давядзеньня пляну да двароў і адсутнасьць масавай работы.

«Лявацкая» недаацэнка работы сярод аднаасобнага сэктару павінна быць неадкладна ліквідавана.

Кулацкая агітацыя супроць збожжазагатовак ня ўсюды сустракае належны адпор. Той факт, што дагэтуль па цьвёрдых заданьнях зданы толькі **54 тоны** сьведчыць аб адсутнасьці націску на кулака ў радзе раёнаў, аб разбазарваньні кулацкага збожжа, аб спэкуляцыі ім.

У сваёй пастанове ЦК канстатуе паўтараньне ў радзе месц сур'ёзных памылак, дапушчаных у мінулым годзе—**самацёку ў адносінах выкананьня цьвёрдых заданьняў**. Апіраючыся на калгасьнікаў і беднату, усе нізавыя арганізацыі павінны **дабіцца поўнага выкананьня цьвёрдых заданьняў не пазьней 20 верасьня.**

Многія раёны да 25-га жніўня ня выканалі нават 20 проц. жнівеньскага пляну. Як кваліфікаваць такую работу, калі, напрыклад, **Горацкі** раён выканаў толькі 3 проц. месячнага пляну, **Дрысенскі**—6 проц., **Быхаўскі**—5,4 проц. Толькі злачынным ігнараваньнем дырэктыў партыі і ўраду і апартуністычнай бязьдзейнасьцю ў правядзеньні важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі можна вытлумачыць такое адставаньне.

Партыйныя і савецкія арганізацыі адсталых раёнаў павінны дабіцца пералому ў правядзеньні збожжазагатовак, паказаць прыклад бальшавіцкага змаганьня за збожжа, масава-растлумачальнай работай забясьпечыць выкананьне калгасьнікамі і аднаасобнікамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Лёзунг перадавых калгасьнікаў: **«да 15-ай гадавіны Кастрычніка скончыць збожжазагатоўкі»** павінен быць шырока скарыстаны для мабілізацыі мас вакол кампаніі. Неабходна ўсямерна папулярызаваць адкры ты ліст ленінградзкіх рабочых, які заклікае калгасьнікаў разгарнуць баявое змаганьне за збожжа.

Неабходна забясьпечыць пляўхільнае ажыцьцяўленьне і папулярызацыю дэкрэту ўраду аб збожжазагатоўках і забароне гандлю збожжам да 15-га студзеня 1933 г. Самыя суровыя меры павінны быць прыняты ў адносінах спэкулянтаў і перакупшчыкаў збожжа і кулакоў, якія зрываюць загатоўкі.

Раўняючыся па перадавых раёнах і калгасах, якія па-ўдарнаму выконваюць пляны загатовак, даб'емся рашаючага пералому на фронце збожжазагатовак.

Адпраўка збожжа на ссыпны пункт.

У першых радох

РАГАЧОЎ. Ва ўборцы азімых і яравых культур рагачоўская МТС паказала сапраўдныя ўзоры бальшавіцкай работы. Амаль усе калгасы, падпарадкаваныя МТС, да тэрміну ўбралі азімыя і яравыя культуры. Пераважная частка калгасаў ужо скончыла абмалот азімых і раньніх яравых — ячменю. Жнівеньскае заданьне па збожжа-загатоўках выканана на 250 проц. На 25 жніўня здана дзяржаве 53 цэнтн., што складае 35,5 проц. агульна-гадавога пляну па збожжы.

Перадавікамі ў загатоўках зьяўляюцца наступныя калгасы: «Чырвоны маяк», які выканаў 130 проц. пляну, «Ленінскае жыцьцё» — 100 проц., «Ніва Кастрычніка» — 92,5 проц., «Чырвоная армія» — 80 проц. і «Камунар» — 78 проц.

С.

***

ЕЛЬСК. Дзякуючы мабілізацыі мас на выкананьне пляну збожжазагатовак, Ельскі раён да 30 жніўня здаў 106 проц. месячнага пляну. Плян памольнага збору за жнівень выканан на 113 проц. заданьня.

***

БЯРЭЗІНА. Жнівеньскае заданьне па збожжазагатоўках да 31 жніўня выканана раёнам на 103 проц. Загатоўлена 128 тон.

Аднаасобнік--па-за ўвагай шклоўскіх арганізацый

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Плян збожжазагатовак па раёне ў гэтым годзе зьменшаны супроць леташняга на 600 тон. Між тым выкананьне пляну ідзе дрэнна. Заданьне на жнівень у 100 тон выканана па 25 проц. У чым прычына? Прычына — у коснасьці і бязьдзейнасьці некаторых сельсаветаў і праўленьняў калгасаў, у няўменьні іх злучыць уборку са збожжазагатоўкамі.

Гарадзішчанскі сельсавет, напрыклад, мае гадавое заданьне — здаць 31 тону. Ён павінен быў мабілізаваць усе сілы для выкананьня пляну, па-бальшавіцку спалучыць уборку з загатоўкамі. Нічога гэтага ня зроблена. Сельсавет ня здаў за жнівень ні аднаго кілёграма. Сакратар Гарадзішчанскай ячэйкі КП(б)Б **Балабаў** на запытаньне, чаму сельсавет ня выконвае пляну, адказаў: «Што-ж нам разарвацца ці што; яшчэ ўборка ня скончана». Такі апартуністычны адказ зьяўляецца характэрным ня толькі для Балабава. Яго можна чуць і ў радзе іншых сельсавецкіх ячэек раёну.

Значна перашкаджае загатоўкам той факт, што ў раёне няма адзінага пляну загатовак па калгасным сэктары. Райкалгассаюз і райзагатзбожжа разьмеркавалі пляны у 230 тон, а райсонаб — у 238 тон. Такое разыходжаньне лічбаў дэзарыентуе калгасную грамадзкасьць. Каму-ж, нарэшце, верыць? Які-ж плян выконваць?

28 жніўня быў арганізаваны усерэйны чырвоны абоз са збожжам, сенам і саломай. Раённыя арганізацыі, у прыватнасьці, райкалгассаюз, не ўзначалілі арганізацыю абозу. Сустрэча калгасьнікаў ня была наладжана. Горш таго, на прыёмным пункце Загатзбожжа атрымаўся затор і чарга, бо важылі па дзьвёх вагах і толькі адзін чалавек выдаваў квіткі. Гэта значна затрымлівала здачу збожжа.

У раённым пляне збожжазагатовак значнае месца займае аднаасобны сэктар — 712 тон. Між тым, аднаасобнікі «выпалі» з-пад увагі партарганізацыі раёну. Сярод іх не праводзіцца ніякай работы, і процант выкананьня пляну зусім мізэрны.

Кампанейшчына і «чарговасьць» зрываюць збожжазагатоўкі па Шклоўскім раёне.

М-ў.

Грамадзкая ўласнасьць сьвяшчэнна і недатыкальна!

БЯЗЬЛІТАСНА КАРАЦЬ ЗЛОДЗЕЯЎ КАЛГАСНАЙ МАЕМАСЬЦІ

Барысаўская пракуратура змагаецца наогул...

Пастановы партыі і ўраду аб рэвалюцыйнай законнасьці і ахове сацыялістычнай маемасьці спатканы рабочымі і працоўнымі масамі сяльства Барысаўскага раёну адпаведным адабрэньнем і гатоўнасьцю ўсямерна садзейнічаць органам пралетарскай дыктатуры ў ажыцьцяўленьні гэтай важнейшай задачы.

За апошні час у Барысаўскім раёне, прыактыўнай дзейнасьці працоўных мас, выкрыта рад фактаў пакраж грамадзкай маемасьці і шкодніцкай дзейнасьці клясава-варожых элемэнтаў.

Нядаўна выкрыта раскрадваньне рознай гародніны ў Стара - Барысаўскай фарме на суму каля 6.000 руб. Быў адзін выпадак, калі шайка злодзеяў учыніла тэрарыстычны акт над грамадзкім вартаўніком і параніла яго з мэтай абрабаваньня. У саўгасе Дудзінка пакрадзена бульбы па 2 тыс. руб. У калгасе «Чырвоны дуб», Глівенскага сельсавету, украдзена 26 пуд. збожжа, частка гэтага збожжа знойдзена ў заможніка Лапіка Якуба, які 3 разы выключаўся з калгасу за культайства і падрыўную, дэзарганізатарскую дзейнасьць. Адначасова выкрыты буйныя растраты па суму каля 6.000 руб. у краме лесрабкопу.

Элемэнты, якія кваліфікуюцца на лёгкую пажыву, злодзеі і шкоднікі грамадзкай маемасьці павінны быць пакараны з усёй суровасьцю рэвалюцыйнага закону. Ніякай літасьці таму, хто замахваецца на грамадзкую маемасьць!

Каб упікнуць пралетарскага правасудзьдзя, варожыя элемэнты сваю шкодніцкую дзейнасьць імкнуцца маскаваць у рознастайных формах. Напрыклад, 24 жніўня ў вёсцы Забашавічы начлежнікі разьвялі вогнішча ў 80 метр. ад калгаснай пушчы. Пушча загарэлася і было зьнішчана каля 700 п. калгаснага сена. Наўмыснае злачынства тут відавочна.

Хтосьці быў ініцыятарам распалу вогнішча імёнца ля калгаснай пушчы. Яго трэба знайсьці. Неабходна тэрміновa правесьці сьледзтва і перадаць суду канкретных вінаватых у шкодніцтве і пакражы.

Трэба адзначыць, што барысаўская пракуратура, сьледчыя органы і асабліва міліцыя яшчэ не даволі апэрацыйна ідуць барацьбу супроць парушальнікаў рэвалюцыйнай законнасьці.

Вось цекалькі фактаў. Каля 6 месяцаў таму назад былі выкрыты злодзеі, якія крадлі сена з калгасу імя Будзённага, Глівенскага сельсавету. Гэтыя злодзеі дагэтуль чамусьці застаюцца непакараванымі. Два месяцы таму назад у калгасе імя Х-годзьдзя савету ўкрадзена карова. Злодзеі выкрыты і ўстаноўлена каму прадана гэта карова, але злачынцы дагэтуль не асуджаны. Калгасьнікі такімі здарэньнямі да раскрадвальнікаў калгаснай маемасьці вельмі абураны. Рай-пракурор тав. **Коцік** дае даведку, што гэтыя злачынцы зарыштаваны, па справе-ж калгасьнікі блукаць іх гуляючымі на волі.

У рабоце кіраўніцтва барысаўскай міліцыі ня было выразнасьці па ажыцьцяўленьні рэвалюцыйнай законнасьці. Самі работнікі міліцыі дапускалі рад абураючых фактаў парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці, за што былы начальнік міліцыі **Моніч** зараз выключан з партыі і перадаецца суду. Былы інспэктар міліцыі **Мільэйт**, які смазваў пры правядзеньні сьледзтва палітычныя справы і ўтварэньні розных бясчынстваў над паасобнымі сялянамі, асуджан зараз на тры гады пазбаўленьня волі. Прыцягнуты да адказнасьці і рад іншых работнікаў міліцыі.

Пастановай ЦВК і СНК БССР органы пракуратуры і РСІ **абавязаны на працягу ліпеня праверыць усе заявы са скаргамі аб парушэньні рэвалюцыйнай законнасьці.** Так сама гэтыя органы абавязаны былі праверыць **практыку накладваньня штрафаў.** У пастанове прапанавалася праводзіць адкрытыя пасяджэньні бюро скаргаў па разглядзе фактаў парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці, праводзіць непасредныя выезды пракураў у сельсаветы, калгасы і саўгасы.

Адкак, гэтыя мэтады работы пракуратура і бюро скаргаў РСІ у Барысаўскім раёне амаль не практыкуюць.

Характэрна, што калі ўдзельнікі раённай канферэнцыі калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў задалі пракурору пытаньне накот праверкі ім заяў аб парушэньні рэвалюцыйнай законнасьці і праверкі практыкі накладваньня штрафу, дык апошні нагардліва адказаў:

— Я ня ставіў мэтай рабіць справаздачу аб сваёй працы, рабіў даклад аб рэвалюцыйнай законнасьці наогул, а таму на пытаньні адказваць ня буду.

Больш бюракратычнага адказу і чакаць нельга.

Людзі не разумеюць і ня хочуць разумець таго, што нічога ня варты агульныя разважаньні без практычнага штодзеннага ажыцьцяўленьня рэвалюцыйнай законнасьці, ня хочуць яны разумець і таго, што рабочы, калгасьнік патрабуе жорсткага пакараньня антыграмадзкіх элемэнтаў і што агульныя разважаньні ім не патрэбны. Ня хоча гэтага зразумець і барысаўскі пракурор т. **Коцік.**

Я. Івашын.

Вышэй пільнасьць!

Цэлы рад карэспандэнцый, якія за апошнія дні зьмяшчаліся ў «Зьвязьдзе», паказваюць, наколькі **ўзрасла пільнасьць** працоўных да аховы грамадзкай маемасьці. Рабочы і калгасьнік рашуча выкрываюць клясавага ворага — кулака, злодзея і інш. чужаедаў, хто пасягае на сацыялістычную грамадзкую, хто прабуе пажыцца за кошт з кожным днём мацнеючай сацыялістычнай уласнасьці.

У Савецкім саюзе адбываецца вялікі працэс перапрабоўкі дробнага ўласьніка ў сьвядомага будаўніка сацыялістычнага грамадзтва. Працоўны селянін, уступіўшы ў калгас, зжывае свае дробна-ўласьніцкія звычаі, пачынае адносіцца да яго маемасьці, як да сваёй, адчувае сябе яе гаспадаром. Праца з цяжкай, абмежаванай рамкамі дробнай гаспадаркі, ненавіснай, ператвараецца ў «справу гонару, адвагі і геройства» (Сталін). Адгэтуль **расьце і нянавісьць** да ўсіх тых, хто ня хоча працаваць, хто хоча жыць за кошт рабочага, калгасьніка. Ленінская пастаноўка пытаньня «хто не працуе, той ня ёсьць» — усё больш і больш прасякае ў сьвядомасьць працоўных.

Пастанова ЦВК і СНК БССР аб ахове грамадзкай уласнасьці ёсьць канцэнтраванае выражэньне запатрабаваньняў працоўных.

Яна выдана па прапанове мільёнаў. Хто не помнае шматлікіх скарг калгасьнікаў і рабочых па мяккасьці суда супроць кулакоў і антыграмадзкіх элемэнтаў? Гэтыя скаргі можна было пачуць і ў глухіх кутках Савецкага саюзу, і ў буйных прамысловых цэнтрах. Вось чаму працоўныя з **вялікім здавальненьнем** сустрэлі гэту пастанову і яшчэ больш павялічылі пільнасьць да аховы грамадзкай маемасьці.

Прапрацоўваючы пастановы ЦВК і СНК, калгасьнікі і рабочыя выкрываюць кулака, злодзея і ўсіх тых, хто свае дзеяньнямі імкнецца падрываць будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі. Простая задача судоў і пракуратуры — **жорстка пакараць злачынцаў**, раскрадвальнікаў грамадзкай маемасьці.

Аднак, ня ўсюды так стаіць справа. У радзе раёнаў (Гомельскі, Віцебскі, Барысаўскі і інш.) пракуратура не выкарыстоўвае поўнасьцю ўзьнятай актыўнасьці мас да аховы грамадзкай маемасьці. Справы па злодзеях грамадзкай уласнасьці часам марынуюцца тыднямі. Нарэшце ў асобных выпадках праяўляюць клясавую сьлепату і за гэтыя злачынствы караюць мякка. Напрыклад, гомельскі нарсуд за пакражу калгасных кароў прыгаварыў трох злодзеяў па... три месяцы пазбаўленьня волі. Адкуль гэта літасьць да клясавага ворага? У пралетарскага суда і пракуратуры ня можа быць літасьці да тых, хто імкнецца разбазарыць грамадзкую ўласнасьць рабочых і калгасьнікаў і гэтым падарваць іх добрабыт.

Выяўляючы і аддаючы пралетарскаму суду раскрадвальнікаў грамадзкай уласнасьці нельга аслабляць барацьбы з іх памочнікамі і саўдзельнікамі—спэкулянтамі. Няпоўная і адназбокая будзе тая барацьба, якая накіравана толькі супроць раскрадвальнікаў грамадзкай уласнасьці, але не закранае яго саўдзельніка—спэкулянта. Злодзей і спэкулянт падзяляюць паміж сабою ўкрадзенае у калгасьнікаў і рабочых. Спэкулянт, скупляючы і перапрадаючы калгасныя прадукты і прадметы шырокага спажываньня, узьвінчваючы іх іх цэны, падрывае добрабыт рабочых і калгасьнікаў. Спэкулянт такі-ж чужаед, як і злодзей.

Вось чаму трэба яшчэ мацней ударыць па спэкулянту і больш энэргічна ўзяцца за ажыцьцяўленьне пастановы ЦВК і СНК СССР аб калгасным гандлі, якая патрабуе «ўсялякі выкараняць перакупшчыкаў і спэкулянтаў, якія прабуюць пажыцца за кошт рабочых і сялян».

Спэкулянтам, якія прабуюць падарваць савецкі рынак, як і злодзеям грамадзкай уласнасьці, няма літасьці!

Займаюцца канстатаваньнем фактаў

Спакойна адначывае праўленьне калгасу імя К. Маркса (Дубровенскі р.). Кожную ноч з поля калгасу раскрадваецца збожжа і сена, а праўленьне толькі моўчкі ўздыхае, яго праца на выяўленьні клясавага ворага, злодзея абмяжоўваецца канстатаваньнем—«зноў пакралі».

У калгасе імя Молатава злоўлен заможнік, які краў калгаснае сена, і дагэтуль над суд не аддаены.

Факты раскрадваньня ёсьць і па калгасах Бельскага, Цеславіцкага і Слабодзкага сельсаветаў. У калгасе «Трудавік» украдзены з поля 4 вазы снапоў. Хто ўкраў—ніхто ня цікавіўся і ня ведае.

Патрэбна праўленьням памянёных калгасаў, нарэшце, зразумець, што канстатаваць пакражу і ня прымаць мер да выяўленьня вінаватых—справа самая лёгкая і што ня весьці барацьбы з пакражамі азначае патураць клясаваму ворагу.

(БЕЛТА).

На II-м пленуме ЦСПСБ

Мабілізаваць масы на барацьбу за ліквідацыю адставаньня прамысловасьці

На другім пленуме Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў былі падведзены вынікі работы прамысловасьці БССР за першыя 7 месяцаў бягучага году. З дакладамі па гэтым пытаньні выступалі намесьнік наркому лёгкай прамысловасьці тав. **Валасевіч** і намесьнік упаўнаважанага наркому цяжкай прамысловасьці т. **Сакаленка.** Яны ўказалі на тыя дасягненьні, якія мы маем у справе росту выпуску валавой прадукцыі параўнальна з адпаведным перыядам мінулага году. **Прадукцыя лёгкай прамысловасьці ўзрасла за першае паўгодзьдзе на 32 проц., па цяжкай — на 26,4 проц.**

Усё-ж, ня гледзячы на гэтыя дасягненьні, работу прамысловасьці ў першым паўгодзьдзі ні ў якім разе нельга прызнаць здавальняючай. Вытворчая праграма прадпрыемствамі лёгкай прамысловасьці выканана на 94 проц., па цяжкай прамысловасьці за 7 месяцаў — толькі на 39,4 проц.

Пры наяўнасьці росту прадукцыйнасьці працы ў параўнаньні з мінулым годам па лёгкай прамысловасьці на 13,3 проц., плян узьняцьця прадукцыйнасьці працы гэтага году значна недавыкананы. Намячалася падняць прадукцыйнасьць працы на 18,5 проц., фактычна-ж яна ўзьнялася на 5,6 проц. Прычым рост заработнай платы дасягнуў 7,6 проц., замест 6,6 проц. паводле пляну. На цяжкай прамысловасьці гэтыя паказальнікі яшчэ горшыя.

Ні адна з галін прамысловасьці ня зьнізіла сабекошту прадукцыі. **Наадварот, па лёгкай прамысловасьці замест зьніжэньня на 2,8 проц., павялічэньне—на 0,8 проц. У справе зьніжэньня сабекошту ганебна адстае цагельная прамысловасьць, якая павялічыла кошт сваёй прадукцыі ў параўнаньні з мінулым годам на 67,4 проц.** Падаражэла прадукцыя асобных мэталязаводаў («Камунар», «Чырвоны адраджэнец», імя Сталіна і «Інтэрнацыянал»).

Да гэтага часу процант браку ў мэталяпрамысловасьці вельмі вялікі, асабліва ў чыгунным ліцьці. На заводах **імя Сталіна, «Чырвоны адраджэнец», «Пралетары», «Чырвоны мэталіст»** брак па чыгунным ліцьці даходзіць ад 11 да 14 проц.

З дакладаў **Сакаленкі і Валасевіча** выявілася, што многія партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі вельмі мала аддаюць увагі барацьбе з прастоямі людзей, варштатаў і машын. Адсюль вялікі перарасход фондаў заработнай платы — па лёгкай прамысловасьці 573 тыс. руб. Яшчэ горшае становішча па цяжкай прамысловасьці. Асабліва выдзяляецца ў гэтых адносінах **Белмэталяаб'яднаньне, якое за паўгодзьдзе перарасходвала фэнд заработнай платы на 630 тыс. руб.**

Разам з недастаткамі ў рабоце прамысловасьці па выкананьні паказальнікаў пляну, падзвычай марудна разгортваюцца тэмпы ў вырабе прадметаў шырокага спажываньня. Па Наркамлёгпраму заданьне выканана ў ліпені на 73,9 проц. Першая дэкада жніўня дала зьніжэньне: заданьне выканана толькі на 25,9 проц. Пры мінімальным заданьні на выпуск прадметаў шырспажыву, прадпрыемствамі цяжкай прамысловасьці заданьне выканана на 61 проц. з новых матар'ялаў і на 82,5 проц. з адкідаў у вытворчасьці.

Тав. **Сакаленка** дакладваў аб тым, што ў справе забесьпячэньня заводаў сырцом у гэтым годзе становішча лепшае, чым яно было ў мінулым. **Зусім зразумела, што невыкананьне прамфінпляну тлумачыцца не «аб'ектыўнымі» прычынамі, а аслабленьнем барацьбы фабрычна-заводзкіх арганізацый за перабудову работы ў вытворчасьці на аснове поўнага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна.**

Наяўнасьць ураўнілаўкі ў зарплаце, аслабленьне ўвагі да паляпшэньня бытавых умоў рабочых прывялі да вялізарнай цякучасьці рабочай сілы на радзе заводаў. У асобных галінах прамысловасьці (керамічная і торфасланцавая) цякучасьць даходзіць да 50 проц. Абязьлічка ў працы, адсутнасьць канкрэтнага кіраўніцтва прадпрыемствамі з боку наркаматаў, а заводзкімі арганізацыямі —нізавымі вытворчымі зьвеньнямі павялічылі прастоі машын і варштатаў. Невыстарчальна разгорнута палітыка-масавая і выхаваўчая работа сярод рабочых, якія кожны дзень уліваюцца ў вытворчасьць.

Дакладчыкі ў прыклад добрай работы прыводзілі **менскі завод «Бальшавік»**, на якім указаньні тав. **Сталіна ажыцьцяўляюцца не на словах і ня ў прыгожых рэзалюцыях, а ў практычнай рабоце кожнай брыгады.**

Выступіўшы ў спрэчках работнік Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў тав. **Левін** спыніўся на недахопах работы ў справе разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і выхаваўчай работы сярод ударнікаў.

— У час, у БССР ужываюць вышэйшыя формы сацспаборніцтва — брыгадны гаспадарчы разрахунак—толькі 33 проц. з агульнай колькасьці ўсіх брыгад. На 1 ліпеня мы мелі зьніжэньне гэтай колькасьці на 2,6 проц. Усё гэта гаворыць аб тым, што гаспадарча-разрахунковыя брыгады не агрымліваюць выстарчальнай увагі з боку заводзкіх арганізацый. Прыкладаў пазбаўленьня назвы ўдарніка вельмі многа. На пільні № 13 з 3.300 рабочых пазбавілі назвы ўдарніка 23 проц. На 6 фанэрных заводах з 596 чал. — пазбаўлена назвы ўдарніка 136 чалавек.

У спрэчках выявілася, што асобныя сэктары ЦСПСБ канкрэтнай дапамогі заводзкім прафарганізацыям не аказвалі.

Перапажнае месца ў кіраўніцтве заводамі яшчэ займаюць цыркуляры. Пацьвярджэньнем гэтага служыць выступленьне рабочага **Добрускай** папяровай фабрыкі **т. Бурава**, які заявіў:

— У нас вялікі прарыў. Я не апраўдваю сабе і ўсіх рабочых фабрыкі. Мы таксама вінаваты, але-ж цэнтральныя, некаторыя гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі больш вінаваты. Яны махнулі рукой на нашу фабрыку. Мы прывыклі добра гаварыць, хваліцца ўсё зрабіць і вельмі мала робім. Да нас часта прыяжджаюць розныя камісіі, зад якіх мала толку. Рабочыя ня ведаюць, што будзе з прадпрыемствам праз тыдзень ці праз месяц. На фабрыку неабходна паслаць моцных людзей і аказаць практычную дапамогу. Паладзіць работу цэхаў, каапэрацыі, сталоўкі. Паставіць улік работы. Зьнішчыць ураўнілаўку ў заработнай плаце. Вось, напрыклад, я лічуся кваліфікаваным сетачнікам і атрымліваю 120 руб. у месяц, а чорнарабочы ў нас зарабляе 250 руб.

Фактаў ураўнілаўкі ў заработнай плаце вельмі многа падавалася ў спрэчках выступаўшых.

— На заводах імя **Варашылава і Сталіна** фурман зарабляе больш за токара 3-га разряду, — **гаворыць тав. Піліпенка,** — або прыбіральшчыца больш за дапаможнага рабочага ліцейнага цэху.

Многа гаварылі ўдзельнікі пленуму і аб тым, што асобныя гаспадарчыя арганізацыі мала аддаюць увагі пытаньням стварэньня ўмоў для працы. Сродкі на ахову працы скарыстоўваюцца не па прызначэньні.

— Сто тысяч рублёў, адпушчаныя на ахову працы Жлобінскаму чыгуначнаму раёну, не скарыстаны, — **гаворыць тав. Якабсон.** — Гаспадарнікі, калі да іх зьвернешся, паказваюць рэзалюцыі паркаматаў «няма матар'ялаў».

Асноўнай прычынай невыкананьня пляну цагельнай і тарфяной прамысловасьці зьяўляецца няўменьне замацаваць рабочую сілу, якая была набрана ў пачатку сэзону. Дрэнныя жыльлёвыя ўмовы, дрэнная пастаноўка грамадзкага харчаваньня прывялі да вялікай цякучасьці рабочай сілы.

— На многіх цагельных адсутнічае барацьба за ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна. Абязьлічка на вучастках работы прывяла да таго, што процант браку цэглы ў параўнаньні з мінулым годам павялічыўся да 40,—гаворыць т. **Альтшуль.**

Рашэньні пленуму павінны быць паложаны ў аснову работы прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый фабрык і заводаў у справе карэннай **перабудовы.**

А. Манькоў.

Пленум ЦСПСБ закрыўся

На раніцішнім пасяджэньні 31-га жніўня працягваліся спрэчкі па дакладу намесьніка старшыні Белкаапсаюзу **тав. Вербы** аб перапрыемствах па пашырэньні харчовай базы рабочага снабжэньня.

Пасьля заключнага слова тав. **Вербы,** з дакладам аб ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніях выступіў нарком зямляробства БССР **тав. Рачыцкі.**

Вячэрняе пасяджэньне было прысьвечана спрэчкам па дакладу тав. Рачыцкага.

Бурнымі воплескамі пленум сустрэў і заслухаў з вялікай увагай выступленьне першага сакратара ЦК КП(б) т. **ГІКАЛО** У сваёй прамове тав. Гікало заклікаў удзельнікаў пленуму ЦСПСБ яшчэ больш рашуча змагацца за выкананьне дырэктыў партыі і ўраду. Мабілізаваць ўсе сілы для поўнага выкананьня і перавыкананьня пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі і баявой падрыхтоўкі да ўступленьня ў другую пяцігодку.

31-га жніўня вечарам пленум закрыўся.

Аб расьсьледваньні лістоў у друк рабочых і калгасьнікаў, допісаў і рабселькораўскіх карэспандэнцый

Пастанова прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і калегіі НК РСІ СССР ад 22 жніўня 1932 году

1. Прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) і калегія НК РСІ СССР адзначаюць, што дырэктыва IV пленуму ЦКК (люты г. г.) аб асаблівай увазе КК-РСІ да расьсьледваньня лістоў рабочых і калгасьнікаў і газэтных допісаў, у якой прапанавалася, «каб ні адзін допіс, які патрабуе ўмяшаньня КК-РСІ, не застаўся неправераным на месцы», — многімі НК РСІ выконваецца нездавальняюча: расьсьледваньне іх робіцца надзвычай марудна, часам фармальна, папяровымі мэтадамі, бяз удзелу масавых арганізацый, а ў радзе выпадкаў апублікаваныя лісты і допісы застаюцца бяз усякага рэагаваньня, рэзультаты расьсьледваньня не заўсёды паведамляюцца друку, не ажыцьцяўляецца кантроль за выкананьнем прапаноў, прынятых па расьсьледваньні допісаў.

2. Прэзыдыум ЦКК абавязвае мясцовыя КК-РСІ ўстанавіць стражэйшы нагляд за абавязковым рэагаваньнем на допісы і лісты рабочых і калгасьнікаў, якія адносяцца да данай вобласьці (краю) і раёну, апублікаваныя як у цэнтральных газэтах, асабліва ў **«Правде»**, так і абласным раённым друку, не чакаючы прысылкі асобных напамінкаў. Да расьсьледваньня лістоў і допісаў павінна быць прыступлена ў дзень атрыманьня іх па месцы і рабіцца ў шайкарацейшы тэрмін, з прыцягненьнем да гэтай работы масавых арганізацый садзейнасьці РСІ. Аб рэзультатах зараз-жа паведамляць рэдакцыі газэт, прычым канкрэтных вінаватых, якія не рэагуюць на сыгналы друку і рабселькораўскія допісы, прыцягваць да адказнасьці, апублікоўваючы ў друку прозьвішчы валакітчыкаў.

3. Прапанаваць рэспубліканскім, абласным (краявым) КК-РСІ арганізацыю і кантроль за расьсьледваньнем рабселькораўскай карэспандэнцыі ўскласьці на пастаяннага адказнага работніка, паведаміўшы прозьвішчы вылучаных таварышоў у КК-РСІ. У рай (гар.) КК-РСІ ўскласьці гэту работу на старшыню КК, або на загадчыка бюро скарг.

4. У мэтах паскарэньня разгляду допісаў зьвярнуць увагу рэдакцый газэт на неабходнасьць накіраваньня лістоў для расьсьледваньня непасрэдна ў раённыя і абласныя (краявыя) КК-РСІ. У ЦКК-РСІ і ў адпаведныя вышэйстаячыя КК-РСІ накіроўваць тыя лісты і скаргі, якія патрабуюць асаблівага ўмяшаньня, або ўзьдзейнасьці іх на асоб, вінаватых у затрыманьні расьсьледваньня і пякрыняцьці мер, асабліва ў адносінах да кантрольных камісій, якія дапускаюць цеганіну пры расьсьледваньні, несвяваснымі адказы рэдакцыям, або абмяжоўваюцца фармальнымі, невыстарчальнымі мерамі замест сапраўднага зьнішчэньня недахопаў.

УВАГА СЫГНАЛАМ РАБСЕЛЬКОРАЎ

(Ліст работніка райгазэты)

Пасьля правядзеньня конкурсу «Праўды» ў Дуброўенскім раёне значна ўзьнялася актыўнасьць рабселькораў, арганізаваўся рад насьценных і штодзённых газэт. Нізавы друк шырока разгарнуў работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, змагаўся супроць клясавай засьмечанасьці калектыўных гаспадарак.

На жаль, мясцовыя партыйныя, савецкія і іншыя арганізацыі вельмі мала зрабілі для таго, каб павысіць дзейнасьць сыгналаў нізавога друку, дзейнасьць лістоў рабселькораў. **Справа рэагаваньня на рабселькораўскія допісы ў Дуброўенскім раёне пастаўлена вельмі кепска.** Падамо некалькі лічбаў аб рэагаваньні раённых арганізацый і ўстаноў на допісы рабселькораў у раённую газэту «За сацыялістычнае будаўніцтва».

За апошнюю палову мінулага году райКК-РСІ не адказала на 35 лістоў, якія паслана ёй рэдакцыяй «За сацыялістычнае будаўніцтва» для расьсьледваньня. Райвыканком не адказаў на 30 допісаў, раймілыцыя на 150, райана на 43, МТС на 105 і г. д. Яшчэ горш пастаўлена справа расьсьледваньня і рэагаваньня па рабселькораўскіх допісы ў гэтым годзе. Раённыя арганізацыі на лічаць патрэбным займацца гэтай справай, ня гледзячы на тое, што ў селькораўскіх лістах мы маем сыгналы аб надзвычай важных фактах.

У гэтым годзе ў Дуброўенскі райкалгасаюз рэдакцыя «З. С. Б.» накіравала **рад допісаў,** у якіх паведамлялася аб **раскрадваньні калгаснай маемасьці, аб клясававорожай дзейнасьці кулакоў у паасобных калектыўных гаспадарках** і г. д. Аднак, райкалгасаюз да гэтага часу не дае ніякіх адказаў на дасланыя яму допісы, ня прымае належных мер па зьнішчэньні тых фактаў, аб якіх сыгналізуюць селькоры.

Ня лепш пастаўлена справа рэагаваньня і ў кіраўніцтве **раённай міліцыі.** Там часта без глыбокага высьвятленьня справы накладваецца рэзалюцыя: «факты не пацьвердзіліся» і па гэтым ставіцца кропка. Ня мала ёсьць фактаў, калі допісы, дасланыя ў тую, ці іншую раённую ўстанову, **губляюцца.** Адойчы ў **райвыканкам** быў даслан для расьсьледваньня допіс селькора Буева, які паведамляў, што ў Мардашэўскім сельсавеце мае месца зрашчваньне работнікаў сельсавету з кулацкімі элементамі, ігнараваньне аднаасобнікаў, «ляванкія» загібы, адміністраваньні і г. д. На працягу доўгага часу райвыканком ніякага адказу не даваў. І толькі **пасьля 4-х напамінаньняў** з боку рэдакцыі, апошняя атрымала ад райвыканкому адказ: **«Допіс, дасланы нам, загублены».** Справа дайшла да таго, што сакратар сельсавету (былы служыцель культу) пачаў пагражаць селькору Буеву, які з прычыны гэтага перастаў пісаць у газэту.

Зусім недапушчальным зьяўляецца і тое, што допісы, якія дасылаюцца рэдакцыяй у **пракуратуру,** таксама залежваюць без рэагаваньня па **5—6 месяцаў.**

У радзе сельсаветаў (**Мардашэвіцкі, Цілявіцкі** і інш.) маюць месца факты **заціску самакрытыкі.** Так, у саўгасе «Станіславава» кіруючыя работнікі саўгасу — Мірончык, Меркін, Мышлен і іншыя сыстэматычна пінствуюць і ня цікавяцца гаспадарчым жыцьцём саўгасу. Калі-ж гэтыя абураючыя факты былі выкрыты камсамольцам Гуліда-вым, апошні быў зьнят з работы. Між тым, ніхто з раённых арганізацый не пацікавіўся гэтай справай, не прыцягнуў да адказнасьці вінаватых.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што ў Дуброўенскім раёне яўна ігнаруюць справу рэагаваньня на лісты рабселькораў, патураюць заціску самакрытыкі, зьнішчаюць дзейнасьць сыгналаў друку.

Нельга, каб і надалей працягваліся падобныя адносіны да лістоў рабочых і калгасьнікаў.

Чарняўскі.

Дырэктар Холад з адміністрацыйным запалам...

(Ліст камандзіра)

Апартуністычная млявасьць, абломаўшчына, самадзёк — такавы ў апошні час стыль у рабоце партыйнай і прафсаюзнай арганізацый саўгасу «Завалочыцы», Глускага раёну. Ужо больш за два месяцы ў саўгасе не праводзіцца агульных сходаў, пасяджэньняў, вытворчых і тэхнічных нарад. Сярод рабочых саўгасу ніхто не праводзіць ніякай масава-растлумачальнай работы, не клапоціцца аб іх матар'яльна-бытавых умовах, аб ахове і нармаваньні працы. Сярод адсталай часткі рабочых маюць месца незадвальненьні, шездаровыя настроі. Між тым, ні бюро партыйнай ячэйкі, ні рабачком не зварачаюць на гэта ўвагі, не растлумачваюць, не адказваюць на хвалюючыя рабочых пытаньні.

Дырэктар саўгасу тав. **Холад** таксама з халадком адносіцца да перабудовы кіраўніцтва і ўсёй работы ў саўгасе па-новаму, але затое з запалам, вартым лепшага выкарыстаньня, падняволе бальшавіцкія мэтады кіраўніцтва адміністраваньнем.

Рабочыя ў часе пасеўнай кампаніі працавалі па 11 гадзін у дзень, прычым адміністрацыя аплочвала ім толькі 10 рабочых гадзін. У значнай колькасьці рабочых не запісаны працоўныя дні яшчэ на пасеўнай кампаніі і да гэтага часу не адноўлены і не аплочаны. Далёка ня добра паставілася ўлік працы. Часта ў саўгасе працуюць без званка, або якога-небудзь іншага сыгналу. Адсюль — багата звышчасовых рабочых гадзін. Нельга не адзначыць таксама і таго, што рабочыя па некалькі месяцаў не атрымліваюць зарплаты.

Ня гледзячы на тое, што сярод рабочых саўгасу ёсьць нямала сапраўдных ударнікаў, уліку іх ніхто не вядзе, ня цікавіцца імі. Усе курортныя месцы разьмеркаваны сярод кіруючых работнікаў саўгасу і ні аднаму рабочаму не ўдалося паехаць на курорт.

Ёсьць выпадкі, калі дырэктар саўгасу без правядзеньня масавай работы і бяз згоды рабочых адміністрацыйным парадкам касуе выходныя дні, не паведамляючы пакуль аб гэтым рабочых. Калі-ж той ці іншы рабочы ня ведаючы аб скасаваньні выходнага дня, ня выйдзе на работу, дырэктар яго звальняе з работы.

Вельмі кепска пастаўлена грамадзкае харчаваньне. Пры наяўнасьці значнага асартымэнту прадуктаў у сталоўцы штодзённа патры разы ў дзень гатуюць адно і тое-ж.

У саўгасе пеяк сваякасабліва «змагаюцца» з ураўнілаўкай: хто працуе на сенажаці, той атрымлівае малако, а хто па ўборцы збожжа, незалежна ад таго, хто як працуе, атрымлівае, як правіла, тую-ж зацірку.

Аб усім гэтым ведаюць у глускіх раённых арганізацыях і ўстановах, але ніякіх захадаў ня прымаюць. Бюро партыйнай ячэйкі саўгасу «Завалочыцы» і рабачком па-ранейшаму «працуюць» з халадком, дырэктар саўгасу тав. Холад «кіруе» з адміністрацыйным запалам, а гаспадарка занепадае.

В. Сьцяпанаў.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае ад глускага райзямаддзелу і райКК-РСІ падрабязнага тлумачэньня закранутых у лісьце т. Сьцяпанава фактаў, якія неабходна неадкладна прагледзець і на іх рэагаваць.

„Зрыў пабудовы чэрапічнага заводу трэба папярэдзіць"

(Ліст рабфакаўца)

Яшчэ ў пачатку мінулага году прэзыдыум **Прапойскага райвыканкому** вылучыў з раённага бюджэту 105 тыс. руб. на пабудову чэрапічнага заводу. Праз некаторы час быў прызначан начальнік будаўніцтва, вызначана месца пабудовы і на ўрачыстым мітынгу — заложан першы камень пабудовы. Будаўніцтва заводу павінна было закончыцца да кастрычніка 1931 году.

Аднак, на справе атрымалася інакш. Будаўніцтва, праўда, распачалося. Было выкарыстана звыш 80 тыс. руб., але, як пасьля аказалася, будаўнічыя работы былі праведзены нядобраякасна, у выніку чаго давялося ўсё перабудоўваць нанава, затрацілі ны на гэта дадаткова 15 тыс. руб.

Будаб'яднаньне, з якім, між іншым, быў заключан дагавор на гэту пабудову, замест таго, каб дапамагчы раённым арганізацыям выкаваць сваячасова будаўнічы плян, самавольным парадкам забрала з будаўніцтва матар'ялы і інструманты...

На гэтым у мінулым годзе справа была скончана.

Як-жа стаіць справа ў гэтым годзе з пабудовай чэрапічнага заводу? Каб уявіць сабе аб тэмпах гэтага будаўніцтва, даволі прывесьці толькі адну лічбу — плян пабудовы на сённішні дзень выканан усяго на 20-25 проц. Грошай няма. Няма чым выплачваць заработную плату. На будаўніцтве засталося зараз ня больш як 8-10 рабочых.

Ні райспажыўсаюз, ні райпрафсавет палец аб палец ня ўдарылі для таго, каб аказаць дапамогу кіраўніцтву пабудовы чэрапічнага заводу. Яны нават не паклапаціліся аб тым, каб наладзіць на будаўніцтве рабочае забесьпячэньне, якое, да рэчы, пастаўлена вельмі кепска. Райвыканком ведаў аб гэтым, але ніякіх захадаў, акрамя рэзалюцый, якія ня выконваліся, ня прымаў.

Значная доля віны за зрыў будаўніцтва, бязумоўна, кладзецца і на дырэктара заводу т. Яршова, які не праявіў належнай настойлівасьці ў справе праверкі выкананьня тых пастаноў, якія выносіліся цэнтральнымі і раённымі ўстановамі аб будаўніцтве. Ён кіраваўся пэсімістычным прынцыпам — «адзін у полі не ваяка» — і бездапаможна апусьціў рукі.

РайКК-РСІ, якая да гэтага часу не аддавала належнай увагі пабудове чэрапічнага заводу, павінна зацікавіцца гэтай справай і дапамагчы ёй. Ня меншай дапамогі трэба чакаць і ад зацікаўленых цэнтральных арганізацый і ўстаноў. Зрыў будаўніцтва павінен быць папярэджан.

ЛЕВІН.

КАДРЫ--ГРАМАДЗКАМУ ХАРЧАВАНЬНЮ

Пытаньне падрыхтоўкі кадраў грамадзкага харчаваньня набывае зараз актуальнейшае значэньне. **ЦК УсеКП(б)** зьвярнуў увагу ўсіх партыйных, каапэрацыйных і гаспадарчых арганізацый на тое, што «індустрыялізацыя краіны і пераход да буйнай аграмаджанай гаспадаркі патрабуюць такой пастаноўкі грамадзкага харчаваньня, якая-б забясьпечыла на справе шырокім масам рабочых, служачых і членам іх сем'яў магчымасьць у поўнай меры карыстацца паслугамі грамадзкага харчаваньня». Гэтым самым ва ўсю шырыню пастаўлена задача аб кадрах, аб людзях, якія павінны забясьпечыць далейшае разгортваньне сеткі грамадзкага харчаваньня, палепшыць бытавыя ўмовы шырокіх працоўных мас.

Рэалізацыя пастановы ЦК ужо дала пэўны рост прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня. Унерадзе яшчэ больш шырокія пэрспэктывы ў галіне разьвіцьця гэтай справы—магутнага ватара ўзьняцьця добрабыту працоўных.

Як ідзе зараз падрыхтоўка кадраў? За апошні час сыстэма грамадзкага харчаваньня БССР дабілася пэўных посьпехаў у гэтай галіне. Толькі па 20 арганізацыях каапхарчу, паводле далёка няпоўных даных, ёсьць каля 5.000 работнікаў грамадзкага харчаваньня, з якіх 771 высока-кваліфікаваных кухараў.

Разгортваецца сетка навучальных устаноў. У Гомелі арганізован паказальны тэхнікум грамадзкага харчаваньня, ў якім навучаецца 140 студэнтаў. У БССР ёсьць 4 ФЗВ з колькасьцю вучняў каля 400 чалавек. Толькі ў гэтым годзе яны павінны выпусьціць больш 100 чал.

Тэхнікум грамадзкага харчаваньня рыхтуе спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі: эканамістаў, тэхналёгаў, хэмікаў, плянавікоў. Ня дрэнна наладжана вытворчая практыка.

Добра абсталявана вучэбная кухня ў Гомелі, якая дае магчымасьць на практыцы павышаць кваліфікацыю будучых інжынэраў грамадзкага харчаваньня. Наладжваецца работа на перакваліфікацыі работнікаў грамадзкага харчаваньня. У гэтым годзе ўжо прапушчана праз розныя курсы больш 800 чал. Зараз працуюць курсы трусаводаў на 100 чал., ТНВ і бракеражу на 50 чал., кухараў для вёскі—100 чал. і гораду—120. Апрача таго, накіравана больш 300 чал. у сталоўкі і кухні на лесазагатоўках, сплаве і торфараспрацоўках.

Аднак, падрыхтоўка кадраў усё яшчэ адстае ад росту попыту на работнікаў грамадзкага харчаваньня. Падрыхтоўку трэба праводзіць у больш шырокім маштабе, больш высокімі тэмпамі, чым датэтуль, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць работы.

У першую чаргу трэба перамагчы абыякія, ігнаруючыя адносіны паасобных работнікаў каапэрацыйнай сыстэмы да пытаньняў падрыхтоўкі кадраў. Ёсьць выпадкі зрыву заняткаў курсаў. У Менску, напрыклад, курсы загадчыкаў сталовак разьлічаны на 30 чал., фактычна паведвала 5-6 асоб, курсы трусаводаў—8-10 ч. У Віцебску, дзе асабліва востра адчуваецца недахват загадчыкаў сталовак, курсы зусім сарваны. У радзе выпадкаў курсы праводзяць па прынцыпу «абы з рук збыць» (Полацак—курсы інструктароў, Гомель — курсавая база); у выніку выпускнікі-інструктары накіроўваюцца на чорную работу.

Аднэй з прычын, якая параджае нізкую якасьць вучобы, зьяўляецца адсутнасьць плянаў падрыхтоўкі кадраў. Па ФЗВ, напрыклад, ня вызначан нават профіль будучага спэцыяліста. Гэты прабел трэба запоўніць. Неабходна рыхтаваць кадры не «наогул», а спэцыялістаў пэўнай кваліфікацыі, якія маглі-б арганізаваць вытворчасьць, выходзячы з адказных задач, што стаяць зараз перад сыстэмай грамадзкага харчаваньня. Патрэбны работнікі, якія могуць па-бальшавіцку змагацца за паляпшэньне снабжэньня рабочых прадуктамі, за ператварэньне сталовак ва ўзорныя цэхі прадпрыемства, за арганізацыю ўласнай харчовай базы. Адсюль задача—рыхтаваць людзей на аснове пэўных плянаў, дакладна распрацаваных навучальных праграм, якія-б выразна акрэсьмівалі профіль будучага работніка. Гэта датычыць ня толькі тэхнікумаў і ФЗВ, але і тых шматлікіх курсаў, якія праводзяцца сыстэмай на месцах.

У прыватнасьці, асаблівую ўвагу трэба аддаць падрыхтоўцы кухараў. Нельга забываць, што якасьць падрыхтоўкі кухара, ступень яго кваліфікацыі, ва многім прадвырашае пытаньне паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

Пытаньне падрыхтоўкі кадраў стаіць востра і ў адносінах **кіруючага складу сыстэмы.** З агульнага ліку кіруючых работнікаў 20-ці каапхарчаў, больш паловы ня маюць вопыту работы і не адпавядаюць свайму прызначэньню. Ня гледзячы на гэта, Белкаапхарч да апошняга часу ня ставіў практычна пытаньня аб перападрыхтоўцы кіруючага складу. Толькі зусім нядаўна ён накіраваў групу работнікаў у Маскву і Ленінград на перападрыхтоўку.

Гаворачы аб кіруючых кадрах нельга прайсьці міма таго факту, што многія партыйныя камітэты ня лічацца з інтарэсамі сыстэмы грамадзкага харчаваньня і часта агаляюць трэсты і каапхарчы. Магілёўскі і Віцебскі райкомы за кароткі час зьмянілі па 3-4 кіраўнікі трэстаў.

Сыстэма грамадзкага харчаваньня ня поўнасьцю выкарыстоўвае такую форму падрыхтоўкі кадраў, як **кароткa-тэрміновыя курсы.** Трэба больш сьмела, больш рашуча пайсьці па гэтым шляху. Ёсьць усе магчымасьці так арганізаваць работу курсаў па пераквалфікацыі, каб не адрываць слухачоў ад практычнай работы на вытворчасьці. Перападрыхтоўка работнікаў зьяўляецца аднэй з важнейшых форм ажыцьцяўленьня лёзунгу «аўладаць тэхнікай справы грамадзкага харчаваньня». Нельга цярпець, калі кіраўніцтвы трэстаў грамадзкага харчаваньня, у прыватнасьці Менскага і Віцебскага, патрабуюць кадраў і ў той-жа час самі зрываюць правядзеньне курсаў.

Адным з тормазаў у разгортваньні гэтай справы зьяўляецца неўрэгуляванасьць пытаньня фінансаваньня. Райсаюзы да апошняга часу не пераводзілі белкаапхарчу 1 проц. адлічэньняў са звароту сталовак. Трэсты і каапхарчы неакуратна ўносяць адлічэньні. У выніку—перабоі ў фінансаваньні навучальных устаноў і курсаў. У гэту справу павінны ўмяшацца органы РСІ.

Сыстэма грамадзкага харчаваньня магла-б дабіцца яшчэ больш посьпехаў, калі-б ёй была аказана патрэбная дапамога з боку прафсаюзаў. Прафарганізацыі, у тым ліку ЦК саюзу грамадзкага харчаваньня, дапамагаюць пакуль што толькі... рэзалюцыямі. Яскравы прыклад: ЦК саюзу толькі ў жніўні паставіла пытаньне аб зрыве веснавога набору ў школы.

Прафэсыянальныя арганізацыі, каапэрацыйныя органы, у прыватнасьці ЗРК, уся пралетарская грамадзкасьць павінны дапамагчы сыстэме грамадзкага харчаваньня ў вярбоўцы людзей на курсы, школы, у наладжваньні работы навучальных устаноў. Толькі пры дапамозе ўсёй пралетарскай грамадзкасьці сыстэма грамадзкага харчаваньня справіцца з усклаўденымі на яе партыяй адказнейшымі задачамі.

М. ПІКМАН.

Тав. ДОМБАЛЬ—віцэ-прэзыдэнт Акадэміі Навук Беларусі

Тав. Домбаль Тамаш Францэвіч нарадзіўся ў 1890 г. у вёсцы Собуў, недалёка Сандаміра, у Польшчы, у сям'і вясковага цесьляра, селяніна-бедняка. Тав. Домбаль вывучаў прыродазнаўчыя і эканамічныя навукі ў венскім (Аўстрыя) і краканўскім (Польшча) унівэрсытэтах, с.-г. эканоміку ў Цімірязеўскай с.-г. акадэміі (Масква) і ў апошні час скончыў з асобнай рэкамэндацыяй на тэарытычную работу, два інстытуты чырвонай прафэсуры; сусьветнай эканомікі і сусьветнай палітыкі і аграрны ІЧП.

Тав. Домбаль з маладых год прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйным вызваленчым руху, у 1918 годзе кіраваў узброеным паўстаньнем супроць аўстрыйска-нямецкіх войск у радзе паветаў на Бісьле, дзе і арганізаваў савет сялянскіх і рабочых дэпутатаў. У пачатку 1919 г. тав. Домбаль быў выбран дэпутатам польскага сойму, зьяўляючыся першым камуністычным дэпутатам, а потым старшынёю першай камфракцыі сойму. У 1920 г. у часе вайны з беларускамі т. Домбаль выступіў у сойме з прамовай, у якой ён ад імя рабочых і сялян Польшчы вітаў Чырвоную армію, як абаронцу польскіх працоўных у іх барацьбе супроць буржуазіі і памешчыкаў. За камуністычную дзейнасьць, як дэпутат т. Домбаль падвяргаўся прасьледваньням, сядзеў у турме ў 1920 г. і потым у 1921-23 г. г., будучы прысуджан варшаўскім акруговым судом да 6 год катаргі, і інш. судамі на розныя тэрміны. У 1923 г. ён быў абменен савецкай уладай і прыехаў у СССР. Тав. Домбаль працаваў у якасьці сакратара аграрнага камітэту выканкому Камінтэрну, нам. старшыні выканкому МОПР'у, члена праўленьня міжнароднага аграрнага інстытуту, быў адным з ініцыятараў скліканьня міжнароднага сялянскага кантрэсу, на якім заснаваны Сялянскі Інтэрнацыянал. Тав. Домбаль зьяўляецца членам прэзыдыуму, намесьнікам генэральнага сакратара і палітсакратаром Сялянскага Інтэрнацыяналу. Тав. Домбаль мае шмат навуковых прац з галіны грамадазнаўча-эканамічных навук, у прыватнасьці, па тэорыі аграрнага пытаньня, прычым некаторыя з іх пераведзены на рад эўрапейскіх і калёніяльных моваў.

У даны момант тав. Домбаль выбран прэзыдыумам Акадэміі і акадэмічным саветам першым віцэ-прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук і адначасова назначан дырэктарам Эканамічнага інстытуту і адказным рэдактарам эканамічнага органу Акадэміі і Дзяржпляну «Сацыялістычнае будаўніцтва», застаючыся ў складзе прафэсуры ІЧП у Маскве.

Тав. Домбаль прыбыў у Менск, прыступіў да работы і ў сувязі з выездам прэзыдэнта тав. Горына ў чарговы водпуск, прыступіў да выкананьня абавязкаў прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук.

Адкрыцьцё германскага рэйхстагу

Прамова тав. Клары Цэткін

БЭРЛІН, 30 жніўня а 3 гадзіне дня **Клара Цэткін**, як старэйшы дэпутат, **адкрыла выбраны 31 ліпеня рэйхстаг.** Ужо задоўга да адкрыцьця пасяджэньня раён рэйхстагу быў акружан узмоцненымі атрадамі паліцыі, якая прапускала да рэйхстагу толькі асобы з адпаведнымі прапускамі.

Некалькі тысяч чалавек, пераважна нацыянал-сацыялісты, у форме, стаўліліся за паліцэйскім ланцугом. У рэйхстаг нацыянал-сацыялістыцкія дэпутаты таксама ўсе зьявіліся ў форме штурмавікоў. Раздаецца званок і ўсе дэпутаты займаюць свае месцы, за выключэньнем фракцыі нацыяналістаў, якая дэманстрацыйна адмовілася прысутнічаць на тэрасяджэньні, якое адкрываецца Кларай Цэткін. На месцы старшыні зьяўляецца Клара Цэткін. **Камуністычная фракцыя вітае яе бурнымі воклічамі: «Рот фронт».**

Клара Цэткін адкрывае пасяджэньне ўступнай прамовай.

«Рэйхстаг, — гаворыць яна, — зьбіраецца ў момант, калі крызіс гінучага капіталізму абрушвае ўвесь цяжар жорсткіх пакут на шырокія працоўныя масы Германіі, на мільёны беспрацоўных, якія галадаюць і якія атрымліваюць жабрацкія дапамогі з добрачынных кас або зусім нічога не атрымліваюць.

Восенью і зімой будуць яшчэ новыя мільёны беспрацоўных. Далейшае скасаваньне калдагавароў яшчэ больш панізіць галодную зарплату. Палітычную ўладу ў Германіі захапіў у сучасны момант праз галаву рэйхстагу прэзыдэнцкі ўрад, які зьяўляецца падручным трэстыяванага манапалістычнага капіталу і буйных аграрыяў, урад, рухаючай сілай якога зьяўляецца генэралітэт рэйхсвэру. Ён гледзячы на сваю ўсемагутнасьць, гэты ўрад поўнасьцю збанкрутаваў у спробах вырашыць свае ўнутрыпалітычныя і вынешнепалітычныя задачы. Унутраная палітыка гэтага ўраду, таксама як і яго папярэдніка, характарызуецца надзвычайнымі дэкрэтамі. Урад лічыць, што права на дапамогу маюць толькі буйныя аграрыі, якія залежылі ў даўгі, збанкрутаваўшыя прамысловцы, банкіры і спэкулянты. Зьнешняя палітыка ураду б'е па інтарэсах працоўнага народу. Гэта палітыка дыктуецца імпэрыялістычнымі, скажэньнямі ўрад узмацніе залежнасьць Германіі ад вэрсальскіх дзяржаў, яго палітыка шкодна адбіваецца на адносінах з Савецкім саюзам — дзяржавай, якая дзякуючы сваёй сумленнай палітыцы міру і свайму эканамічнаму ўздыму прадстаўляе сабой апору для працоўнага насельніцтва Германіі.

Бясьсільле рэйхстагу і прэзыдэнцкага ўраду зьяўляецца сымптомам нагібелі буржуазнага лібералізму, якая няўхільна ідзе побач з крушэньнем капіталістычнага спосабу вытворчасьці. Гэта нагібель лібералізму знаходзіць свой ясны адбітак у сацыял-дэмакратаў, якія ў тэорыі і на практыцы стаяць на пагніўшай глебе буржуазнага грамадзтва. Палітыка цяперашняга ўраду зьяўляецца ня чым іншым, як простым працягам палітыкі ўраду Брюнінга, які падтрымліваўся сацыял-дэмакратамі.

Палітыка «меншага зла» ўжо ўзмацніла ў рэакцыйным лягеры сьвядомасьць сваёй сілы, яна павінна яшчэ ажыцьцявіць вялізарнейшае зло, а іменна, прывучыць масы да пасыўнасьці. Перад тым, як рэйхстаг выкажацца адносна асобных актуальных задач, рэйхстаг павінен усьвядоміць і выкапаць свой аспэкт абавязак і ён павінен сьвергнуць урад, які прабуе, парушаючы канстытуцыю, ліквідаваць рэйхстаг. Ён павінен прыцягнуць да адказнасьці прэзыдэнта краіны і міністраў за парушэньне канстытуцыі. Але падымаць супроць ураду абвінавачаньне перад вярхоўным судом роўналежна таму, што скардзіцца д'яблу па чорта.

Зьвяржэньне ўраду рэйхстагам можа быць толькі сыгналам да наступленьня і да поўнага разгортваньня клясавых сіл па-за парляментам. Адкак, разгортваньне па-за парляментам актыўнасьці працоўных не павінна абмяжоўвацца зьвяржэньнем антыканстытуцыйнага ўраду. Яно павінна быць накіравана далей да зьвяржэньня буржуазнай дзяржавы і яе асновы — капіталістычнай гаспадаркі.

Барацьба працоўных мас супроць распачлівай галечы зьяўляецца адначасова барацьбой за поўнае вызваленьне. Гэта — барацьба супроць капіталізму, які прыгнечвае і эксплёатуе, за вызваляючы сацыялізм. Узрокі працоўных мас няўхільна павінны быць накіраваны да гэтай мэты. Яны не павінны даць адурманіць сябе ілюзіямі аб «вызваляючай дэмакратыі» і не павінны даць запалохаць сябе жорсткімі гвалтамі капіталізму, які фінансуе выратавацца шляхам сусьветнай крывавай бойні, фашысцкага тэрору і грамадзянскай вайны. Надзённай задачай зьяўляецца стварэньне адзінага фронту ўсіх працоўных для таго, каб адкінуць назад фашызм і тым самым захаваць прыгнечаным і эксплёатаваным іх сілы, сілу іх арганізацый і нават іх фізычнае жыцьцё.

Перад гэтай настойлівай гістарычнай необходнасьцю павінны адступіць назад усе разьвядзеныя палітычныя і прафсаюзныя ўстаноўкі.

Усе тыя, якія знаходзяцца пад пагрозай, якія пакутуюць, павінны аб'яднацца ў адзіны фронт супроць фашызму і яго даверных ва ўрадзе. Забастоўкі і паўстаньні ў розных краінах гавораць працоўным Германіі, што яны не адзінокі. Усюды абязьдоленыя і ўніжаны пераходзяць у наступленьне ў барацьбе за ўладу. Я адкрываю рэйхстаг згодна абавязку ў якасьці старэйшага дэпутата. Я спадзяюся дажыць яшчэ да таго радаснага дня, калі я ў якасьці старэйшай адкрыю першы зьезд Саветаў у Савецкай Германіі».

Прамова Клары Цэткін была пакрыта бурнымі авацыямі камуністычнай фракцыі.

ГЕРМАНІЯ ДАБІВАЕЦЦА РОЎНАПРАЎЯ ВА ЎЗБРАЕНЬНЯХ

Германская нота Францыі

ПАРЫЖ, 1. У французкім міністэрстве замежных спраў атрымана нота германскага ўраду па пытаньні аб рэарганізацыі рэйхсвэру. Зрыё мае намер адразу пасьля прыбыцьця ў Парыж склікаць раду міністраў для абгаварэньня германскай ноты.

Інтэрв'ю ваеннага міністра Шлейхэра

БЭРЛІН. Агенцтва «Вольф» перадае інтэрв'ю ваеннага міністра Шлейхэра з прадстаўніком італьянскай газэты «Рэсто Дэль Карліно». Шлейхэр заявіў: «Германія патрабуе сабе тых-жа правоў, якія маюць іншыя дзяржавы ў адносінах арганізацыі і размеркаваньня сваіх узброеных сіл, іх узбраеньня, ваеннага ўмацаваньня краіны, выробу зброі. Цяперашняя германская ваенная сыстэма прафэсыянальнай армії, якая служыла на працягу доўгага тэрміну, зьяўляецца самай слабай, самай дарагой. Калі іншыя дзяржавы ня хочуць браць прыклад з гэтай сыстэмы, што адпавядала-б сэнсу іх абяцаньняў аб разбраеньні, дык яны павінны дазволіць Германіі перабудаваць свае ўзброеныя сілы тымі мэтадамі, якія яны самі лічаць неабходнымі для сваёй нацыянальнай бясьпечнасьці. Пры сыстэме ўсеагульнай вайсковай павіннасьці або міліцыі салдат, які служыць кароткі час, абыходзіцца значна таней, раходы, якія затрачваюцца на яго, амаль на 100 проц. ідуць у карысьць абароны краіны. Германская армія ня мае наветранага ўзбраеньня, танкаў, цяжкай, а таксама зэнітнай артылерыі. Флёт ня мае падводных лодак, авіяматак, буйных крэйсэраў. Усе гэтыя абмежаваньні павінны быць або пашыраны на ўсе дзяржавы, або зьнішчаны для Германіі.

Такім чынам разьмеры перабудовы рэйхсвэру залежаць ад ступені гатоўнасьці моцка-ўзброеных краін да разбраеньня. Калі патрабаваньні аб роўнапраўі і ўзбраеньнях будуць адхілены, то германскі ўрад ня стане больш прымаць удзелу ў работах канфэрэнцыі па разбраеньні. Больш таго, парушэньне становішча аб разбраеньні краінамі, падпісанымі вэрсальскі дагавор, прымусіць германскі ўрад дабівацца бясьпечнасьці нацыянальным шляхам.

* * *

БЭРЛІН, 1. Часопіс «Дэр Хэймат'ліст» публікуе артыкул Шлейхэра аб выніках канфэрэнцыі па разбраеньні і германскім патрабаваньні роўнапраўя ва ўзбраеньнях. Закранаючы маючую адбыцца перабудову германскіх узброеных сіл, Шлейхэр піша:

«У згодзе з усімі членамі ўраду я ў сваёй прамове, перададай па радыё, заявіў аб неабходнасьці рэканструкцыі ўзброеных сіл у выпадку, калі дзяржавы-пераможцы будуць у далейшым адмаўляцца ад выкананьня сваіх абяцаньняў разбраіцца. Разьмер рэарганізацыі рэйхсвэру залежыць ад жаданьня высока-ўзброеных краін разбраіцца. Германія пратэстуе для сваёй бясьпечнасьці ні больш ні менш як на тое, чаго патрабуюць для сябе іншыя дзяржавы. Яна гатова ў далейшым супрацоўнічаць у справе запраўднага разбраеньня, аднак, нельга далей злоўжываць цярпеньнем германскага народу.

Сваё патрабаваньне аб роўнапраўі ва ўзбраеньнях Германія высунула, як пробны камень выпрабаваньня добрай волі яе партнэраў паводле дагавору. Гэта патрабаваньне адносіцца да прынцыповых пытаньняў структуры армії, а таксама да пытаньня так званых наступальных відаў зброі, якія пераходзяць у Жэнэве рашэньня ператварыліся ў сродкі абароны. Калі падводныя лодкі, авіяматкі, ваенныя самалёты, цяжкая артылерыя, а таксама танкі зьяўляюцца толькі сродкамі нацыянальнай абароны, то Германіі нельга адмаўляць у гэтай зброі. Калі другія дзяржавы ўмацоўваюць свае межы валам жалеза і бэтону, то на падставе якога права хочуць адмовіць у гэтай абароне Германіі?»

Забастоўка партовых рабочых у Гдыні

ДАНЦЫГ, 30. Як паведамляюць з Гдыні (польскі порт), там учора **выбухнула забастоўка партовых рабочых**, да якіх далучыліся каманды ўсіх стаячых у парту параходаў як польскіх, так і чужаземных.

СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ СУПРОЦЬ ІНТЭРВЭНЦЫІ

МАСАВЫЯ МІТЫНГІ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ МЕНСКУ

ЗАКЛІК НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ БССР

Ад імя навуковых працаўнікоў Савецкай Беларусі шлем палкае прывітаньне антываеннаму кангрэсу і яго ініцыятарам і арганізатарам — Анры Барбюсу, Максіму Горкаму і Рамэн Роллану. Запэўняем іх у тым, што **навуковыя працаўнікі БССР самым энэргічным чынам падтрымаюць іх работу.**

Мы ўпэўнены, што антываенны кангрэс і выбраны ім камітэт адыграюць вялізарную ролю ў справе згуртаваньня працоўных мас усяго сьвету для запраўднай барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны, якая набліжаецца, з падрыхтоўкай інтэрвэнцыі супроць СССР, у справе выкрыцьця буржуазнага нацыфізму Лігі нацый, канфэрэнцыяй на «разбраеньні», якія служаць для падрыхтоўкі новай страшэннай бойні, гібельнай для ўсёй цывілізацыі, навукі і культуры.

Мы заклікаем перадавую частку заходняэўрапэйскай інтэлігенцыі, якая жадае запраўды змагацца з новай імпэрыялістычнай бойняй, з вайной супроць краіны, дзе будуецца сацыялізм, пасьледаваць прыкладу Дрэйзэра, Барбюса, Эйнштэйна, Роллана і інш. і далучыцца да антываеннага кангрэсу.

Вітаючы ініцыятыву Анры Барбюса аб стварэньні фонду антываеннага кангрэсу, **мы заклікаем усіх навуковых працаўнікоў прыняць актыўны ўдзел у зборы сродкаў у гэты фонд. Уносім у фонд антываеннага кангрэсу 200 руб. і выклікаем усіх навуковых працаўнікоў.**

Віцэ-прэзыдэнт БАН—Т. Домбаль.
Старшыня ЦБСНР БССР — акад. **Е. Рыўлін.**
Адказны сакратар ЦБСНР — праф. **Усьпенскі.**
Акад. Нікольскі Н. М.
Акад. Панкевіч П..
Праф. Ленц А. К.
Праф. Піотуховіч Н. М.
Акад. Замоцін.
Акад. Бурсьцін.
Праф. Мелкіх.
Заслужаны дзеяч навукі — праф Гаўсман.

Мастакі вітаюць антываенны камітэт

Агульны сход савецкіх мастакоў Менску вітае новаабраны на антываенным кангрэсе ў Амстэрдаме міжнародны антываенны камітэт і далучае свой голас да пратэсту ўсіх працоўных з поваду недапушчэньня галяндскім урадам савецкай дэлегацыі на кангрэс.

Мастакі Менску выказваюць упэўненасьць, што міжнародны антываенны камітэт разгорне шырокі рух ва ўсіх краінах сярод працоўных і лепшай часткі міжнародзкай інтэлігенцыі супроць падпальшчыкаў імпэрыялістычнай вайны, супроць Лігі нацый, 2-га інтэрнацыяналу і іншых шатнпіцеляў ваеннай прапаганды.

«Мы, мастакі БССР, гаворыцца ў рэзалюцыі,— знаходзячыся на рубяжы двух сьветаў, абавязаны асабліва ўважліва сачыць за мапэўрамі клясавага ворага і сваю творчасьць, у большай сваёй частцы, паставіць на службу абароне першай у сьвеце сацыялістычнай краіны».

Агульны сход мастакоў Менску заяўляе, што пры першай спробе імпэрыялістаў арганізаваць новую вайну, мастакі, усе як адзін стануць на абарону краіны Саветаў.

Толькі рашучая барацьба мільённых мас не дапусьціць новай сусьветнай бойні

На лятучым мітынгу варашылаўцы пастанавілі паслаць гарачае пралетарскае прывітаньне антываеннаму кангрэсу, яго кіраўніком і ініцыятарам. «Паводле вопыту імпэрыялістычнай вайны 1914-1918 гадоў,— заяўляюць варашылаўцы,— мы ведаем, што без рашучай барацьбы мільённых мас супроць падпальшчыкаў і арганізатараў сусьветнай бойні, без рашучай барацьбы супроць імпэрыялістаў і іх урадаў немагчыма дабіцца міру паміж народамі, папярэдзіць пагрозу новай вайны і пазбавіць працоўных ад тых грандыёзных ахвяр, якія нясе ім вайна».

Далей варашылаўцы адзначаюць, што «нацыфіцкія фразы», «разбраенчыя» кампэрэнцыі Лігі нацый зьяўляюцца толькі інструментам буржуазіі для прыкрыцьця і замаскаваньня падрыхтоўкі да новай вайны. Мы ўпэўнены, — заяўляюць варашылаўцы, — што кангрэс няройдзе ад слоў да справы ў барацьбе з пагрозай вайны, няройдзе да запраўднай арганізацыі мас супроць імпэрыялістычных драпежнікаў».

Удзельнікі мітынгу запэўнілі кангрэс і яго кіраўнікоў, што шматмільённы пралетарыят, працоўнае сялянства і працоўная інтэлігенцыя СССР акажуць кангрэсу і справе, за якую ён змагаецца, магутнае і дзейснае падтрыманьне.

Вітаючы ініцыятараў кангрэсу — Рамэн Роллана, Барбюса, Роселя, Дрэйзэра і ўлюбёнага пралетарскага пісьменьніка—Максіма Горкага, варашылаўцы заявілі свой пратэст супроць недапушчэньня савецкай дэлегацыі на антываенны кангрэс.

Удзельнікі мітынгу даручылі заводзкаму камітэту пачаць збор сродкаў у дапамогу кангрэсу і яго кіруючым органам.

Далоў падпальшчыкаў новых войн!

Рабочыя, служачыя і ІТР женскай абутковай фабрыкі, у колькасьці 1.200 чалавек, шлюць гарачае прывітаньне антываеннаму кангрэсу і кіраўнікам яго, якія ставяць сваёй мэтай барацьбу з пагрозай імпэрыялістычнай вайны.

—Мы цалкам далучаемся да прамовы рабочых Савецкага саюзу аб матар'яльных падтрыманьні кангрэсу, аб стварэньні агульнага фонду для барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны, — заяўляюць рабочыя ва ўхваленай рэзалюцыі.

Калектыў пастанавіў арганізаваць збор сродкаў.

Далоў падпальшчыкаў новых войн!

Арганізуем збор сродкаў на ўмацаваньне абароны краіны

Мы **рабочыя і служачыя друкарні «Зьвязда»**, сабраўшыся на мітынг і заслухаўшы аб рабоце антываеннага кангрэсу ў Амстэрдаме, шлем гарачае пралетарскае прывітаньне ўдзельнікам і арганізатарам сусьветнага антываеннага кангрэсу, якія паставілі сваёй задачай арганізаваць барацьбу працоўных усяго сьвету з нарастаючай пагрозай новай імпэрыялістычнай бойні.

Па прыкладу пралетараў іншых заводаў і фабрык СССР. мы таксама **арганізуем збор сродкаў у фонд антываеннага кангрэсу.**

ПЕРАД ВЯЛІКІМІ КЛЯСАВЫМІ БАЯМІ Ў ГЕРМАНІІ

Наступленьне прадпрыемцаў на зарплату

БЭРЛІН, 1. Не чакаючы нават выданьня адпаведных надзвычайных дэкратаў, германскія прамысловцы на аснове ўрадавай эканамічнай праграмы прыступілі да наступленьня на зарплату шляхам ліквідацыі тарыфных дагавароў. Саюз прадпрыемцаў Горскай **вугальнай прамысловасьці абвясьціў аб скасаваньні з 30 верасьня тарыфных дагавароў, якія ахапляюць звыш 200 тыс. гарнякоў.** Прамысловцы патрабуюць, каб у будучым тарыфныя дагаворы заключаліся асобна кожнай капальняй. Яны разьлічваюць дабіцца больш значнага зьніжэньня зарплаты і прарваць адзіны фронт рурскіх гарнякоў.

Саюз прадпрыемцаў сярэдня-германскай вугальнай прамысловасьці таксама абвясьціў аб скасаваньні тарыфнага дагавору з рабочымі.

Статыстычны бюлетэнь, які выдаецца вядомым германскім эканамістам **Кучынскім**, канстатуе, што ў ліпені ў сувязі з уступленьнем у сілу раду трапэйскіх пастаноў аб зьніжэньні зарплаты пры адначасовым росьце беспрацоўя і пазбаўленьня цэлых груп беспрацоўных права на дапамогу, **жыцьцёвы ўзровень германскай рабочай клясы ўпаў да нябывала нізкага пункту.** Сярэдняя зарплата прамысловага рабочага складала ў ліпені **22 маркі** ў тыдзень супроць **30 марак** у ліпені мінулага году. Кучынскі канстатуе для таго, каб сярэдняя зарплата рабочага - мэталіста раўнялася афіцыяльна вылічанаму ўрадам пражытачнаму мінімуму, яна павінна быць павышана **на 108 проц.** Зарплата тэкстыльшчыкаў — на 163 проц., зарплата будаўнічага рабочага — на 170 проц.

Б. бэрлінскі паліцэй-прэзыдэнт Вэйде адданы пад суд

БЭРЛІН, 26. Друк паведамляе, што пракуратура ўзбудзіла справу супроць былога намесьніка бэрлінскага паліцэй-прэзыдэнта сацыял-дэмакрата Вэйда і былога начальніка бэрлінскай паліцыі палкоўніка Геймансбэрга па абвінавачаньні ў «процідзеяньні падзвычайнаму дэкрату па зьвяржэньні прускага ўраду, і абвяшчэньні стану аблогі ў Бэрлін—Брандэнбургу».

З АПОШНЯЙ ПОШТЫ

КАНФЭРЭНЦЫЯ СКОНЧАНА...

У пачатку жніўня на Бабруйскім дрэва-апрацоўчым камбінаце адбылася першая харчовая канфэрэнцыя. У аглядзе друку «Два камбінаты», прысьвечаным гэтай канфэрэнцыі, «Зьвязда» пісала:

> «Некалькі дзён работы канфэрэнцыі — гэта дні напружанага і наосьчанага глыбокім зьместам масавага абмеркаваньня задач будаўніцтва другога камбінату (уласнай харчовай базы прадпрыемства. — Рэд.). 200 дэлегатаў—непасрэдных удзельнікаў канфэрэнцыі. — гэта яшчэ ня ўсё. Актыў канфэрэнцыі складала ўся маса рабочых і ў гэтым сакрэт не посьпехаў».

Да канфэрэнцыі на камбінаце праводзіўся сталінскі паход за паляпшэньне рабочага снабжэньня. Добра праводзіўся, сур'ёзна, па-дзелавому, пры актыўным удзеле рабочых. Даволі сказаць, што лік удзельнікаў гэтага паходу дасягнуў на камбінаце 300 чалавек. Цэнтральны камітэт КП(б)Б у спэцыяльнай пастанове аб выніках сталінскага паходу падкрэсьліў, што на камбінаце паход праводзіўся, як

> «... МАСАВАЯ КАМПАНІЯ, МАБІЛІЗУЮЧЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА РАБОЧАЕ СНАБЖЭНЬНЕ ШЫРОКІ АКТЫЎ РАБОЧЫХ...»

Канфэрэнцыя прыняла пэўныя пастановы. Пастановы канкрэтныя, дзелавыя, насычаныя багатым фактычным матар'ялам. Адзначаючы гэта, мы ў нашым аглядзе адначасова падкрэсьлілі, што

> «... ГАЛОЎНАЕ ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ. ГАЛОЎНАЕ Ў ТЫМ, КАБ УСЕ ПАСТАНОВЫ КАНФЭРЭНЦЫІ БЫЛІ ПЕРАТВОРАНЫ Ў ЖЫЦЬЦЁ. ТУТ АСАБЛІВА ПАТРЭБНА ПРАЯВІЦЬ САПРАЎДНУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ НАСТОЙЛІВАСЬЦЬ, САПРАЎДНУЮ РАШУЧАСЬЦЬ, КАБ ПАЧАТАЯ НА КАМБІНАЦЕ ВЯЛІКАЯ І КАШТОЎНАЯ СПРАВА БЫЛА ДАВЕДЗЕНА ДА КАНЦА».

Аб гэтым іменна на камбінаце і **забылі.** Скончылася канфэрэнцыя, скончылася, відавочна, і жаданьне арганізацый камбінату выконваць свае слова. Матар'ялы, атрыманыя намі з Бабруйскага камбінату, сьвядчаць аб трывожным стане спраў. Прынятыя пастановы былі акуратна падпыты і... закінуты ў архіў. **З часу харчовай канфэрэнцыі прайшло 20 дзён.** Тэрмін, як бачыце, зусім выстарчальны для таго, каб ужо разгарнуць канкрэтную практычную работу. Інакш відавочна думае партыйнае, прафсаюзнае і гаспадарчае кіраўніцтва камбінату. Людзі, трэба проста сказаць, плюнулі на пастановы канфэрэнцыі. Ні партком, ні дырэкцыя, ні заводзкі камітэт пальцам не паварушылі, каб замацаваць дасягнутыя посьпехі. На злой іроніі пастаноўка рабочага снабжэньня на камбінаце пасьля канфэрэнцыі пагоршылася.

Няма чаго і дзівіцца. 20 дзён людзі, так сказаць, адначывалі, сядзелі склаўшы рукі, нібы справа рабочага снабжэньня, справа грамадзкага харчаваньня могуць вырашыцца самі сабой, самацёкам. Калі да канфэрэнцыі быў пэўны ўзьдым, была пэўная рашучасьць і ініцыятыва, калі да канфэрэнцыі партыйная арганізацыя камбінату і яго газэта зрабілі шырока разгарнуць сталінскі паход, дык потым усё гэта зьнікла, сьціхла, апынулася ў абдымках глыбокага і моцнага сну.

Усю работу па грамадзкім харчаваньні на камбінаце ўзвалілі на плечы ЗРК і казпхарчу. Партком, дырэкцыя, заводзкі камітэт — у баку. Іх, бачыце, гэта справа не датычыць. Канфэрэнцыя праведзена, чаго-ж больш?

Ну, а ЗРК і казпхарч, таксама што называецца, любяць займацца аліпойшчынаай. Іх нікольні ня турбуе, што работа сталовак за апошні час стала нікуды ня вартай, што ў сталоўках пануюць бруд і чарві. Каапэратары камбінату толькі і ведаюць, што лаюцца адзін з другім, бо ніяк ня могуць вырашыць, хто для сталовак павінен загатаўляць прадукты...

«За ўдарныя тэмпы» — газэта камбінату — са свайго боку паўтарае тыя-ж самыя памылкі, якія мы адзначалі ў аглядзе «Два камбінаты», а іменна — не даводзіць справы да канца. Газэта піша, што бязьдзейнасьць казпэратараў на камбінаце

> «... мяжуецца са злачынствам перад рабочым калектывам».

Ацэнка моцная, што і гаварыць. Тым ня менш рэдакцыя ўлітраецца не назваць ні аднаго канкрэтнага нясьбіта зла і абыйсьці маўчаньнем дэмабілізацыйныя настроі партыйнага, гаспадарчага і прафэсыянальнага кіраўніцтва на камбінаце. Што за бязьзубая, з дазволу сказаць, самакрытыка!

Бабруйскі райком павінен сказаць сваё слова!

ГАЗЭТНЫЯ ЗАМЕТКІ

Конкурс на лепшы твор для дзяцей

Дзіцячая літаратура Беларусі дасягнула за гады першай пяцігодкі сацыялістычнага будаўніцтва значных посьпехаў. Але гэтыя посьпехі характарызуюцца больш колькасьнымі, чым якаснымі паказальнікамі. Дзіцячая літаратура на сёньняшні дзень фронт найбольш адсталы ад шпаркіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Між тым, наша задача—падрыхтаваць усебакова разьвітых членаў камуністычнай грамады.

У сувязі з 10-годзьдзем дзіцячай камуністычнай арганізацыі юных піянэраў імя Леніна, Наркамасьветы БССР, ДВБ, ЦСПСБ, ЦБ ДКА, ЦК ЛКСМБ, ЦК ДД жры ЦВК БССР, аб'яднаньне савецкіх пісьменьнікаў Беларусі **абвяшчаюць з 1-га верасьня г. г. шырокі конкурс-спаборніцтва на лепшы літаратурна-мастацкі і навукова-папулярны твор для дзяцей.**

Конкурс-спаборніцтва ставіць сваёй задачай прыцягнуць увагу ўсіх пісьменьнікаў, мастакоў, рабочых ударнікаў, закліканых у літаратуру, настаўнікаў і літаратурныя сілы нашых навучальных устаноў да справы стварэньня новых ідэалёгічна-вытрыманых, высока-мастацкіх твораў для дзяцей, твораў, якія-б «у яркай і вобразнай форме паказвалі сацыялістычную перабоку краіны і людзей і выхоўвалі дзяцей у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму».

Галоўныя тэмы, на якія асабліва павінны зьвярнуць увагу аўтары, наступныя: **сацыялістычнае будаўніцтва ў БССР і СССР (класавая барацьба, героіка нашых дзён і наша будучыня); жыцьцё, быт і работа піянэрарганізацыі; новая політэхнічная школа Маркса-Леніна; змаганьне за сусьветны Кастрычнік; наша мінулае; абарона краіны; аўладаньне тэхнікай; юныя бязьбожнікі** і інш.

Кожны твор для дзяцей павінен быць высока ідэйным, мастацкім творам, які-б поўнасьцю адпавядаў запатрабаваньням сучаснай педагогікі.

Творы могуць быць напісаны любой літаратурнай формай (проза, паэзія, драматургія) на адным з моваў нацыянальнасьцей БССР. Конкурс закрыты.

За лепшыя творы вызначаны наступныя прэміі:

1-я прэмія—5.000 руб.
2-я прэмія—2 прэміі—па 3.000 р.
3-я прэмія—3 прэміі—па 1.000 р.
4-я прэмія—6 прэмій—па 500 р.
5-я прэмія—10 прэмій—па 300 руб.

За прэміяваныя творы аўтары атрымліваюць павышаны ганарар. Для ацэнкі матар'ялаў і кіраўніцтва конкурсам-спаборніцтвам арганізавана камісія-журы ў складзе: нам. наркома асьветы БССР тав. **С. Я. Вальфсона** (старшыня камісіі журы), загадчыка ДВБ тав. **А. Некрашэвіча** (нам. старшыні) і членаў т. т. **Зайзіт, Гарадкіна, Лынькоў, Гарбуз, Якімовіч, Бэйрах, Гараўскі і Каблукоў.**

Рукапісы дасылаюцца па адрасу: Менск, Савецкая 59, ДВБ, Юндзет—сэктар з памет кай: «на конкурс». Апошні тэрмін прысылкі рукапісаў—1 красавіка 1933 году.

Ч. В. А. адказнага рэдактара А. МІТЛІН.

Паведамленьні

— Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 10 верасьня у 10 гадз. раніцы ў г. Чэрыкаве будзе працаваць выязная НТ ЦКК КП(б)Б на разгляду апэляцыйных партспраў Чырвонапольскага, Чэрыкаўскага і Прапойскага раёнаў. Выклікаюцца наступныя т. т.: Балотнікаў А. П., Бэзікаў А. Я., Рыжыкаў Ц. М., Круглікаў В. І. Еўсеенка Е. І., Майсеяў П. П., Лальнеў Г. П., Ганчароў П А. (Чырвонапольскі раён), Гладчанка Е. Я., Карпенка Т. В., Харытонаў П. Х., Складухін С. Р. (Прапойскі раён), Лабоўка К. Л., Яршова І. Абавязкова прадстаўленьне на ПТ характарыстыкі ад парт. яч. аб апошняй рабоце.

— З 5-га па 25-га верасьня Гомельская саўпартшкола праводзіць дасаўпартшкольскую падрыхтоўку ўсіх паступаючых у саўпартшколу. Паведамленьне аб выклику на падрыхтоўку разаслана Гомельскай саўпартшколай індывідуальна ўсім паступаючым. Прапануецца ўсім таркомам і райкомам КП(б)Б забясьпечыць поўную і своячасовую яўку на падрыхтоўку ўсіх выкліканых. Заработная плата ўсіх выкліканых на падрыхтоўку захоўваецца па месцы працы, згодна пастановы Наркампрацы за № 29 1930 г.

Нам. заг. культпропу ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.

«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА». Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30. Каса—з 1 г. дня. — Гукавы гаваршчы фільм **ГАЙЛЬ МОСКАУ.**

„Пралетары" — Дзесяты дзіцячы сэанс **ВОСТРАЎ ЦУДАУ.** Пачатак у 2 г. дня.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". — Мастацкі фільм **АСАБНЯК ГАЛУБІНЫХ** Звыш пр.—Кіно-хроніка Саюзкіно

„СПАРТАК" Пач.: 7, 8-15, 9-30, 10-45. Каса—з 5 г. — Мастацкі фільм **САЛЁНЫЯ ХЛОПЦЫ** Кіно-п'еса ў 6 частках.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ". **СЁНЬНЯ, 3 верасьня і штодзенна** (зусім новы экземпляр) мастацкі фільм **ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯБАЛЯТА.** Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз вечара. КАСА адкрыта ад 4 г. 30 м.

3-га верасьня, у сувязі з урачыстым пасяджэньнем гаркому ЛКСМБ і гаркому КП(б)Б, летні тэатр саду „Прафінтэрн" **ЗАКРЫТ.** Білеты, узятыя на паказ цыганскага тэатру на гэты дзень маюць моц на 4 верасьня. БЕЛДАМЕЦ.

Летні тэатр саду „Прафінтэрн". „ЮЗЖ-ХОЛ". Ад 4-га верасьня—штодзенна—гастролі дзяржаўнага маскоўскага музычнага цыганскага тэатру „РАМЭН". Будзе паказана: **„ЖЫЦЬЦЁ на КАЛЁСАХ".** Муз. паказ у 3-х дзеяк. Па ходу паказу—цыганскія скокі і песьні. Пачатак у 9 гадзін вен.—Падрабязнасьці ў афішах. Білеты, узятыя на 3 верасьня, маюць моц на 4-га верасьня. Усе прапускі і кантрамаркі ня маюць моцы. Белдамец.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА **ДЗЯРЖБАНКУ** абвяшчае 3-цінабор курсантаў на 6-цімесячныя **курсы плянавікоў і вучотна-апэрацыйных работнікаў.** Апошні тэрмін падачы заяў з анкетамі, рэкамендацыямі і іншымі дакументамі ва ўсе аддзяленьні Дзяржбанку і задзел кадраў канторы аж ку—16 верасьня 1932 г. За ўсімі дзведкамі і дадатковымі з умовамі прыёму на курсы зварачацца ва ўсе аддзяленьні Дзяржбанку ў гарадох і раёнах і ў аддзел кадраў канторы Дзяржбанку (Менск, рог Савецкай і Ленінскай, 3-ці паверх, тэлефон 17-31). Усебелканторв Дзяржбанку.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ **„КАМУНСНАБ"** *даводзіць да ведама* ЎСІХ зацікаўленых арганізацый, што і м прыступлена да збору **заявак на пашыраное абсталяваньне на 1933 год.**

1) Усе прадпрыемствы, арганізацыі і кіраўніцтвы прадстаўляюць заяўкі ў свае трэсты, аб'яднаньні ці рэспубліканскія цэнтры для ўключэньня іх у агульныя заяўкі апошніх.
2) Прадпрыемствы і арганізацыі, якія ня маюць сваіх рэспубліканскіх цэнтраў, прадстаўляюць свае заяўкі непасрэдна Бел. Аддз. **„Камунснаб".**
3) Тэрмін прадстаўленьня заявы КАМУНСНАБ'у — **да 15-Х,** пасьля якога ніякіх дадатковых прымаца **НЯ БУДУЦЬ.** заяўкі. у тым ліку і
4) Наменклатура пажарнага абсталяваньня і форма заявак рэспубліканскім цэнтрам намі рассылаюцца, а таксама іх можна атрымаць у Аддз. **„Камунснаба".**
5) Заяўкі накіроўваць—Менск, Даўгабродзкая 3, **Камунснаб".**

„КАМУНСНАБ".

Дом Асьветы. 3-га верасьня, у 7 гадз. веч., адбудзецца **пазачарговы партыйна-камсамольскі сход працасьветы.** Парадак дня: 1) Пастанова ЦК УсеКП(б) аб вучэбных праграмах і рэжыме ў пачатковай і сярэдняй школе. 2) Рознае. Запрашаюцца ўсе асьветнікі гор. Менску. Бюро.

Тэлефоны рэдакцыі: Адказны рэдактар—4-27; сакратарыят—10-74; сэктары: партыйнага будаўніцтва—13-80; эканамічна-прамысловы—13-89; калгасрацыі і снабжэньня—13-80; вайскова-палітычны—13-80; транспартны—6-19; сацыялістычнага земляробства—6-19; замежнай інфармацыі—6-19; сэктар ударных брыгад—6-19; лістоў рабочых і калгасьнікаў—6-19; культурнага будаўніцтва—6-19, агляду друку—6-19; аблікграфія—6-19; бюро расьсьледаваньня—6-19. Тэлефоны канторы: Загадчык канторы—7-81: аддзел аб'яў і бухгальтэрыя—7-81. Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 63.

Менск, друкарня «Зьвязда» Галоўлітбел № 337.